71.4(4Беи)
С 512

Д 19
Д 20

Беларускі універсітэт культуры

УДК 008.001 (476) (043.3)+374.7:364.446 (476)+
+316.6:[028.2+75:615.851.82+78:615.851.82] На правах рукапісу

Смолік Аляксандр Іванавіч

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ДЗЕЙНАСЦЬ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫХ ІНСТЫТУТАЎ БЕЛАРУСІ Ў ПОСТКАТАСТРОФНЫМ СОЦЫУМЕ

24.00.01 — тэорыя культуры

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара культуралогіі

Мінск 1999

Работа выканана ў Беларускім універсітэце культуры

Навуковы кансультант — доктар філасофскіх навук, прафесар, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь Я.М.Бабосаў

Афіцыйныя апаненты — доктар культуралогіі, дацэнт Марозаў І.В.

доктар філасофскіх навук, прафесар Э.К.Дарашэвіч

доктар філасофскіх навук, прафесар І.Д.Розенфельд

Апаніруючая арганізацыя — Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы Беларускага дзяржаўнага універсітэта

Абарона адбудзецца __________ на пасяджэнні савета па абароне доктарскіх дысертацый Д. 09.03.02 пры Беларускім універсітэце культуры па адрасе: 220001 г.Мінск, вул.Рабкораўская, 17, аўд. 231.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў бібліятэцы Беларускага універсітэта культуры.

Аўтарэферат разасланы ______________________________

Вучоны сакратар савета па абароне дысертацый — кандыдат гістарычных навук, дацэнт П.Р.Ігнатовіч



## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Актуальнасць тэмы дысертацыі.**

Сацыяльна-палітычная трансфармацыя, якая адбываецца ў краінах СНД у апошняе дзесяцігоддзе XX ст., характарызуецца асаблівасцямі функцыяніравання палітычных суб'ектаў, складанай і супярэчлівай дынамікай эканамічных тэндэнцый, крызісам сацыяльна-маральных ідэалаў і каштоўнасцей, звужэннем магчымасцей для рэалізацыі эфектыўнай сацыяльна-культурнай палітыкі.

Функцыяніраванне трансфармацыйнага поля Беларусі мае сваю адметнасць. Трынаццаць гадоў Рэспубліка Беларусь адчувае эканамічныя, сацыяльна-псіхалагічныя, радыеэкалагічныя і медыцынскія наступствы буйнейшай тэхнагеннай катастрофы ў гісторыі чалавецтва. Вынікі катастрофы сур'ёзнейшым чынам закранулі ўсе сферы жыццядзейнасці пацярпелых рэгіёнаў, нацыі і дзяржавы ўвогуле: вытворчасць, эканоміку, навуку, культуру і свядомасць. У посткатастрофны перыяд адбылася істотная трансфармацыя сацыяльна-культурнага асяроддзя, усёй сферы сацыякультурнай дзейнасці. Асаблівасці развіцця трансфармацыйных працэсаў у посткатастрофным соцыуме патрабуюць грунтоўнай распрацоўкі шэрага тэарэтычных канцэпцый, мадэляў і канкрэтных праграм, скіраваных на стварэнне эфектыўнай сістэмы дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў. Ва ўмовах звужэння магчымасцей дзяржавы ў забеспячэнні насельніцтва сацыяльна-культурнымі паслугамі адбыліся істотныя змяненні інфраструктуры культуры, прынцыпаў і функцый дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры і мастацтва.

На розных этапах развіцця грамадства існавала фіксаваная частка сацыяльнай арганізацыі, якая займалася ўпарадкаваннем сумеснага жыцця і дзейнасці людзей, трансляцыяй ведаў і традыцыйных элементаў культуры.

Праблемамі даследавання вытворчасці, захавання, распаўсюджвання і арганізацыі спажывання культурных паслуг займаліся многія філосафы, сацыёлагі і культуролагі сусветнай супольнасці. Спробы апісаць этнакультурныя асаблівасці, уласцівыя розным народам Еўропы, былі зроблены яшчэ ў XVIII ст. К.Гельвецыем, Д.Юмам, І.Кантам. Ф.Вальтэр, Дж.Віка, Ш.Л.Мантэскье, І.В.Гётэ, В.Гумбальт і іншыя разглядалі культуру як духоўнае багацце грамадства і ўнутраны здабытак чалавека, заснаваны на яго пастаянным імкненні да ісціны, дабра і прыгажосці.

Працэсы ўзаемадзеяння паміж культурамі, уплыў рэлігіі і маралі на інтэграцыю грамадства прааналізавалі Э.Дзюркгейм, М.Вэбер. Прыхільнікамі структурна-функцыянальнага падыходу з'яўляюцца амерыканскія і англійскія культуролагі XX ст. А.Крэбер, Р.Бенедзікт,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дж.Мід, Т.Парсанс, Р.Мертан. Функцыі культуры з пункту гледжання канкрэтнай мэтазгоднасці разглядалі расійскія філосафы У.І.Ленін, В.Г.Пляханаў, А.А.Багданаў, У.С.Салаўёў. Навуковае абгрунтаванне духоўных фактараў як асновы гістарычнага развіцця грамадства зрабілі А.Тойнбі, О.Шпенглер, М.А.Бярдзяеў, Л.П.Карсавін, І.А.Ільін. Тэорыю, якая раскрывае дынаміку культурна-гістарычнага працэсу, стварыў П.А.Сарокін. Арыгінальную канцэпцыю культуры як самаразвіццёвай сістэмы распрацаваў М.С.Каган.

Культуралагічныя даследаванні ў Беларусі пачаліся ў эпоху Адраджэння. Праблемы нацыянальнай і рэлігійнай самаідэнтыфікацыі, біблейскай і антычнай традыцый адлюстроўваліся ў творах Ф.Скарыны, С.Буднага, В.Цяпінскага, М.Сарбеўскага, С.Полацкага, М.Сматрыцкага, А.Філіповіча.

Упершыню да навуковага асэнсавання праблем фарміравання айчыннай культуры беларускія даследчыкі звярнуліся ў канцы XIX – пачатку XX ст. Пытанні развіцця беларускай культуры закраналіся ў этнаграфічных і фальклорных працах П.А.Бяссонава, Л.Бароўскага, Я.Ф.Карскага, А.Г.Кіркора, Е.Р.Раманава, М.Я.Нікіфароўскага, І.А.Сербава, Ю.Ф.Крачкоўскага, П.В.Шэйна, М.І.Каспяровіча, М.Федароўскага, Я.П.Тышкевіча і інш. Яны на аснове глыбокага комплекснага параўнальна-гістарычнага абагульнення фактычнага матэрыялу навукова абгрунтавалі нацыянальную самабытнасць беларусаў як самастойнага славянскага народа, які стварыў сваю багатую і арыгінальную культуру. Значны ўклад у даследаванне вытокаў, відаў беларускага мастацтва зрабіў вядомы мастацтвазнавец М.М.Шчакаціхін.

Вызначальную ролю ў распрацоўцы тэорыі і гісторыі айчыннай культуры адыгралі працы беларускіх вучоных другой паловы XX ст. Г.І.Барышава, Э.К.Дарашэвіча, Р.Б.Смольскага, М.І.Крукоўскага, У.М.Конана, В.Ф.Шматава, З.Я.Мажэйкі, А.В.Сабалеўскага, Н.Ф.Высоцкай, Ю.М.Чурко, Я.М.Сахуты, М.С.Кацара, А.І.Смагіна, В.Ф.Нячай, Д.С.Трызны, В.У.Пазнякова, І.Д.Розенфельда і інш. У працах беларускіх мастацтвазнаўцаў даследуюцца разнастайныя аспекты фарміравання і функцыяніравання прафесійнага і народнага мастацтва, даецца гістарычны агляд развіцця духоўнай культуры ў Беларусі.

Шэраг даследчыкаў 80—90-х гадоў грунтоўна займаюцца вывучэннем сацыяльных фактараў развіцця сусветнай і айчыннай культуры. У працах М.І.Аксюціка, М.М.Каралёва, А.А.Корбут, Н.У.Самерсавай даследуюцца сутнасць, характэрныя асаблівасці, змест і тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў сучасных умовах. Прадметам іх даследаванняў з'яўляюцца арганізацыйна-педагагічныя фактары развіцця культурна-адпачынкавай інфраструктуры.



Нягледзячы на разнастайнасць навуковых падыходаў да праблем дыягностыкі сацыяльна-культурных працэсаў і многааспектнасць яе даследавання, культуралагічны аспект суб'ектаў, функцый і прынцыпаў сацыяльна-культурнай дзейнасці вывучаны недастаткова. У культуралогіі яшчэ не даследавана дзейнасць сацыяльна-культурных інстытутаў з пазіцый сучаснай культурнай сітуацыі ў краіне і адносна канкрэтных рэгіянальных сацыяльна-культурных умоў, уласцівых посткатастрофнаму соцыуму, асабліва з пункту гледжання пераадолення найбольш устойлівых і негатыўных наступстваў катастрофы.

У сувязі з гэтым аўтарам робіцца спроба звярнуцца да навуковага асэнсавання ролі духоўнай культуры ў рэгуляцыі розных сфер сацыяльнага быцця ва ўмовах трансфармацыі грамадства, дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў, якія забяспечваюць функцыяніраванне культуры, а таксама прапанаваць практычна выверaную парадыгму пераадолення сацыяльна-культурных вынікаў катастрофы.

**<u>Сувязь работы з буйнымі навуковымі праграмамі, тэмамі.</u>** Даследаванне праводзілася ў цеснай сувязі з комплекснымі даследаваннямі сацыяльна-эканамічных праблем у рамках выканання Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў аварыі на ЧАЭС. Праблемы, якія распрацаваны дысертантам, з'яўляюцца часткай дзяржаўнай навукова-тэхнічнай праграмы "Навукова-метадалагічныя асновы нацыянальна-культурнага развіцця ва ўмовах дэмакратычна-прававой дзяржавы", якая зацверджана Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь 21 красавіка 1997 г. (пастанова № 379). Аўтар уваходзіў у склад навуковага калектыву па распрацоўцы канцэпцыі і праграмы падрыхтоўкі кадраў культуры і мастацтва.

Дысертант у 1997—1999 гг. узначальваў часовы навуковы калектыў па распрацоўцы канцэпцыі сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі насельніцтва сродкамі мастацтва.

Праблема даследавання сугучная асноўным накірункам Рэспубліканскай праграмы сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі і сацыяльна-прававой абароны дзяцей і падлеткаў, пацярпелых у выніку катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, якую выконвае з 1991 г. Нацыянальны інстытут адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**<u>Мэта і задачы даследавання.</u>** Галоўнай мэтай даследавання з'яўляюцца комплексны аналіз сутнасці, характэрных асаблівасцей, зместу, функцый і сучасных тэхналогій дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў у посткатастрофным соцыуме, вызначэнне месца і ролі сацыякультурных інстытутаў у комплекснай сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі насельніцтва, пацярпелага ад чарнобыльскай катастрофы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У адпаведнасці з вызначанай мэтай дысертантам пастаўлены наступныя задачы:

— даследаваць сутнасць і характар трансфармацыйных працэсаў у сацыяльна-культурным асяроддзі, выкліканых рэфармаваннем эканомікі, сацыяльнай сферы і наступствамі чарнобыльскай тэхнагеннай катастрофы;

— выявіць месца і ролю сацыяльна-культурных інстытутаў у працэсе грамадскага развіцця посткатастрофнага соцыуму;

— раскрыць узаемасувязі і ўзаемазалежнасці функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці;

— вызначыць тэндэнцыі фарміравання каштоўнасных арыентацый асобы посткатастрофнага соцыуму;

— разгледзець асноўныя формы, метады і спосабы мадэліравання дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў па творчым развіцці і духоўным узбагачэнні насельніцтва соцыуму;

— прааналізаваць змест і ўмовы функцыяніравання тэхналагічных мадэляў для захавання, аднаўлення і развіцця фізічнага і духоўнага здароўя чалавека, яго інтэлектуальнага ўдасканалення.

**<u>Аб'ект і прадмет даследавання.</u>**

Аб'ект даследавання — сацыяльна-культурныя інстытуты посткатастрофнага соцыуму.

Прадмет даследавання — перадумовы і шляхі фарміравання асобаснай і культурнай падсістэм посткатастрофнага грамадства.

**<u>Гіпотэза.</u>**

Гіпотэза даследавання заключаецца ў тым, што культурная дзейнасць адлюстроўвае мэты і функцыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры, вызначае шляхі, метады і сродкі яе рэалізацыі ва ўмовах палітычнага, эканамічнага і духоўнага абнаўлення грамадства і мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі. Для паспяховай рэалізацыі прынцыпаў сучаснай культурнай палітыкі неабходна зыходзіць з таго, што асоба неадназначная, з'яўляецца адначасова носьбітам як пазітыўных, так і негатыўных якасцей. Усё залежыць ад прыродных асаблівасцей асобы і ўмоў, у якіх яна развіваецца. У залежнасці ад гэтага ў чалавеку актуалізуецца стваральны ці разбуральны пачатак.

На асобу посткатастрофнага соцыуму негатыўнае ўздзеянне аказвае шэраг сацыяльных фактараў, якія ўзніклі ў выніку трансфармацыі сацыяльна-культурнага асяроддзя. Уплыў сацыяльна-культурнага асяроддзя на асобу адбываецца перш за ўсё праз сацыяльна-культурныя інстытуты, якія прама ці апасродкавана ўздзейнічаюць на ўяўленні чалавека аб навакольным свеце, арыентуюць яго ў сацыяпрасторы.

Асаблівасці дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў посткатастрофнага соцыуму заключаюцца ў тым, каб стварыць



аптымальныя ўмовы для развіцця культурнай дзейнасці чалавека, рэалізацыі яго інтэлектуальна-творчага патэнцыялу ў працэсе творчага самавыяўлення.

**<u>Метадалогія і метады праведзенага даследавання.</u>**

У вырашэнні галоўных задач дысертацыйнай работы аўтар абапіраўся на асноўныя палажэнні структурна-функцыянальнай тэорыі, істотным кампанентам якой з'яўляецца аналіз нарматыўна-каштоўнасных і сімвалічных сродкаў рэгуляцыі сацыяльнай жыццядзейнасці. Пры гэтым базавым з'яўляецца пастулат аб агульным функцыянальным адзінстве грамадства як узаемасувязі сацыяльных і культурных структур. Культура ўяўляе сабой інтэграваную сістэму, у якой кожны элемент адпавядае пэўнай патрэбнасці ўсёй цэласнасці, выконваючы канкрэтную частку работы. Істотным у структурна-функцыянальным падыходзе з'яўляецца палажэнне аб дыферэнцыяцыі функцый, якая забяспечваецца дыферэнцыяцыяй сацыяльных структур, што складваюцца ва ўпарадкаваную сістэму.

Пры вызначэнні месца і ролі культуры ў трансфармацыйным грамадстве дысертант улічваў прынцыпы аднаго з навуковых накірункаў – сінергетыкі, сутнасць якога заключаецца ў тым, каб разгледзець развіццё сістэм як самаразвіццё. У дачыненні да культуры гэта азначае, што пры ўсіх уплывах на яе з боку сацыяльна-эканамічных ўмоў, у якіх яна існуе, рухальныя сілы яе змяненняў закладзены ў ёй самой.

Для вызначэння агульнай структуры дзейнасці і месца ў ёй культурных фактараў дысертант абапіраўся на палажэнні канцэпцый дзейнасці і духоўнай вытворчасці. Паводле іх нельга разглядаць культуру толькі як пазавытворчую дзейнасць і зводзіць яе да таго, чым чалавек займаецца пасля працы ці акрамя працы. Разам з тым неправамерна раствараць культуру ва ўсім аб'ёме дзейнасці. У рамках гэтай тэорыі культура прысутнічае ва ўсіх сферах сацыяльнай дзейнасці і сістэмах рэгуляцыі.

Зыходзячы са спецыфікі задач і мэты даследавання дысертантам улічваліся палажэнні канцэпцый катастрафізму, эвалюцыянізму, тэорыі цывілізацыі.

Для вырашэння задач даследавання выкарыстоўваўся сістэмна-дзейнасны метад вывучэння посткатастрофнага соцыуму ў структурах яго эканамічных, сацыяльных і сацыяльна-культурных дэтэрмінантаў.

Спецыфіка сацыякультурнага асяроддзя даследуемага соцыуму, вызначэнне ўзаемасувязі і залежнасці розных відаў дзейнасці ў ім, навізна праблемы патрабавалі выкарыстання разнастайных метадаў даследавання, асабліва класіфікацыі і апрацоўкі вялікага эмпірычнага матэрыялу.

Забеспячэнне адэкватнага адлюстравання аналізуемай праблемы і атрыманне дакладных вынікаў дасягаліся з дапамогай агульнанавуковых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

метадаў пазнання: абагульнення і сістэматызацыі тэарэтычных даных; параўнання, аналізу, сінтэзу, эксперыменту і апрацоўкі вынікаў эмпірыкі; пабудовы навуковых тэорый і гіпотэз; фармалізацыі, класіфікацыі і мадэліравання вывадаў даследавання. Значнае месца займаюць сацыялагічныя даследаванні і іх апрацоўка. У працэсе вывучэння было апытана каля 4000 жыхароў Гомельскай вобласці, 130 работнікаў культуры Гомельшчыны і Магілёўшчыны. Гэта дазволіла больш дакладна вызначыць сацыякультурныя арыентацыі насельніцтва соцыуму, працэс іх фарміравання, эфектыўнасць дзейнасці розных тыпаў устаноў культуры.

Даследаванне выконвалася ў тры этапы з выкарыстаннем метадаў, адпаведных характару вырашаемых на кожным этапе задач.

На першым этапе даследавання — аналітычным — былі прааналізаваны тэорыя і гісторыя праблемы на падставе вывучэння манаграфій, навуковых артыкулаў, навукова-метадычных матэрыялаў, рэгіянальных праграм сацыякультурнага развіцця. Гэта дазволіла вызначыць ступень навуковай распрацаванасці праблемы, удакладніць асноўны катэгарыйна-паняційны апарат, выкарыстаны ў даследаванні; сфармуляваць мэты, задачы, рабочую гіпотэзу.

На другім этапе — дыягнастычным — разгледжаны посткатастрофны стан інфраструктуры культуры, псіхафункцыянальны стан насельніцтва соцыуму, выяўлены асноўныя праблемы і супярэчнасці ў функцыяніраванні посткатастрофнага грамадства, вызначаны месца і роля культурнай дзейнасці ў сацыялізацыі чалавека да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці. Аналіз эмпірычнага матэрыялу, дзейнасці як традыцыйных, так і новых устаноў культуры, агляд матэрыялаў друку па адпаведнай тэматыцы, вывучэнне статыстычных аглядаў па культуры і мастацтве дазволілі вызначыць разнастайнасць формаў дзейнасці сацыякультурных інстытутаў па фарміраванні, узнаўленні індывідуальнай і грамадскай каштоўнасці чалавека соцыуму.

На трэцім этапе — фарміруючым — на падставе метадаў сацыяльна-культурнага праектавання і эўрыстычнага праграміравання была распрацавана сістэма спецыяльных мер, якія ў канкрэтных сацыяльна-культурных умовах павінны забяспечыць эфектыўную дзейнасць прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры па творчым развіцці і духоўным узбагачэнні насельніцтва соцыуму.

**Навуковая навізна і значнасць атрыманых вынікаў.**

Аўтарам упершыню праведзена комплекснае навукова-тэарэтычнае даследаванне асаблівасцей функцыянірвання культурнага і асобаснага кампанентаў посткатастрофнага грамадства, абагульнены і сістэматызаваны назапашаныя веды ў галіне дыягностыкі і карэкцыі крызісных станаў, узніклых пад уплывам тэхнагенных і гуманітарных катастроф.



З пазіцый структурна-функцыянальнага падыходу ўсебакова прааналізавана развіццё культурнай і сацыяльна-арганізацыйнай сістэм грамадства ў посткатастрофны перыяд і абгрунтавана выснова аб фарміраванні пад уздзеяннем наступстваў чарнобыльскай трагедыі посткатастрофнага соцыуму, які па мностве параметраў істотна адрозніваецца ад экалагічна чыстых рэгіёнаў.

Абапіраючыся на палажэнні тэорыі сацыяльных і культурных сістэм Т.Парсанса і канцэпцыі структурнага функцыяналізму Р.Мертана, аўтарам пераасэнсаваны змест, прынцыпы і метады дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў у посткатастрофным грамадстве, удакладнены функцыі культуратворчай дзейнасці, абгрунтавана неабходнасць пераходу ад суб'ект–аб'ектнай мадэлі да суб'ект–суб'ектнай формы сацыякультурнай дзейнасці ў посткатастрофных умовах жыццядзейнасці.

На падставе сацыяльна-культурнага аналізу ўсебакова даследавана сацыядынаміка культуры і выяўлены вытокі аноміі, абгрунтаваны тэзіс аб тым, што пад уплывам наступстваў чарнобыльскай катастрофы адбываюцца парушэнне культурнага адзінства, распад сістэмы духоўных каштоўнасцей.

Псіхааналітычны метад даследавання культуры посткатастрофнага грамадства дазволіў аўтару вызначыць у якасці важнейшых функцый прафесійнага і аматарскага мастацтваў кампенсатарную і псіхатэрапеўтычную функцыі, на аснове якіх магчыма фарміраванне транскультурнай псіхіятрыі.

У рамках аналізу дзейнасці сацыякультурных інстытутаў у посткатастрофным грамадстве распрацавана канцэпцыя выкарыстання мастацтва, культуры і мастацкай творчасці для сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі насельніцтва, пацярпелага ад чарнобыльскай трагедыі. Канцэпцыя рэабілітацыі дапоўнена новым метадам: рэабілітацыяй сродкамі мастацтва і творчага самавыяўлення.

Аўтарам прапанаваны і эксперыментальна абгрунтаваны арыгінальныя, нетрадыцыйныя метадалагічныя падыходы да вырашэння культуралагічных і сацыяльна-псіхалагічных праблем посткатастрофнага грамадства, мадэліравання сацыяльнага жыцця як цэласнасці.

У ходзе ажыццяўлення доследна-эксперыментальнай часткі даследаваны найбольш эфектыўныя тэхналогіі падрыхтоўкі кадраў для сацыяльна-культурнай дзейнасці, вызначаны новыя тэхналогіі дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва ў посткатастрофным соцыуме.

**Практычная (эканамічная, сацыяльная) значнасць атрыманых вынікаў.**

Практычная значнасць дысертацыйнага даследавання заключаецца ў тым, што ў сучасных умовах распрацаваныя матэрыялы ўжо выкарыстоўваюцца дзяржаўнымі і грамадскімі структурамі ў галіне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сацыяльна-педагагічнай адукацыі, сацыяльна-культурнай дзейнасці, у развіцці метадаў і формаў узаемадзеяння прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры. Распрацавана эксперыментальна праверaная тэхналагічная праграма фарміравання кадравага патэнцыялу для сацыяльна-культурных інстытутаў посткатастрофнага соцыуму.

Матэрыялы даследавання пакладзены ў аснову вучэбнага і практычнага дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ, работнікаў устаноў культуры "Сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя насельніцтва мастацтвам", "Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме", манаграфій "Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі", "Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме".

Вынікі даследавання выкарыстоўваліся педагагічнымі работнікамі пры распрацоўцы вучэбных планаў і дзяржаўных стандартаў вышэйшай адукацыі ў галіне культуры і мастацтва. Аўтар быў ініцыятарам увядзення ў Пералік спецыяльнасцей вышэйшай школы Рэспублікі Беларусь спецыялізацыі "рэабілітацыя асобы сродкамі мастацтва", па якой на працягу шасці гадоў у Беларускім універсітэце культуры ажыццяўляецца падрыхтоўка кадраў для посткатастрофнага соцыуму.

У працэсе даследавання аўтар прыйшоў да высновы аб неабходнасці ўдасканалення сістэмы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях. Прапановы дысертанта былі падтрыманы Міністэрствам культуры, Гомельскім і Магілёўскім аблвыканкамамі. У выніку ў Мазыры функцыяніруе філіял факультэта завочнага навучання Беларускага універсітэта культуры. У Гомелі і Магілёве навучанне ў бібліятэчным тэхнікуме і каледжы вядзецца па вучэбных планах, узгодненых з вучэбнымі планамі Беларускага універсітэта культуры.

<u>**Асноўныя палажэнні дысертацыі, якія выносяцца на абарону.**</u>

1. Чарнобыльская катастрофа па аб'екце катастрафічнага развіцця з'яўляецца полікампанентнай і ўключае не толькі тэхналагічныя і экалагічныя, але і сацыяльна-псіхалагічныя, культуралагічныя кампаненты. Як найбольш разбуральнымі выступаюць не толькі сам перыяд катастрофы, але і посткатастрофнае працяканне працэсаў, згубных для здароўя чалавека, яго генафонду, сацыяльна-культурнага асяроддзя. Аналіз посткатастрофных працэсаў з сацыяантрапалагічнага і аксеалагічнага пунктаў гледжання, з улікам унікальнасці прыроды асобы, яе вышэйшай каштоўнасці ў іерархіі каштоўнасных арыентацый грамадства сведчыць аб тым, што на першы план выступае праблема жыцця і забеспячэння здароўя, узнаўлення індывідуальнай і грамадскай каштоўнасцей чалавека.



2. Страта стымулаў і матывацый, якія дзейнічалі ў дакатастрофны перыяд, паступова прыводзіць да дэфармацыі культурных інтарэсаў і патрэб, каштоўнасных арыентацый і іншых якасцей асобы ва ўмовах посткатастрофнага развіцця. У сувязі з гэтым першаступенную ролю набывае вызначэнне сродкаў і метадаў карэкцыі фарміруючага ўплыву на насельніцтва посткатастрофнага соцыуму аб'ектаў зносін і сацыяльна-культурных інстытутаў.

3. Сутнасць сацыяльна-культурнага асяроддзя посткатастрофнага соцыуму неабходна разглядаць як дыяпазон і ўзровень існуючых каштоўнасцей, засвоеных лакальнымі сацыяльнымі інстытутамі, выражаных ступенню іх засваення насельніцтвам, прадстаўленага тыпамі і формамі жыццядзейнасці. Асаблівасці гістарычнага развіцця, спрыяльныя геаграфічныя ўмовы стварылі унікальную структуру культурнага асяроддзя Палесся і Падняпроўя і вылучылі як асноўны кампанент традыцыі, якія сталі вызначальным фактарам яго накіраванасці. Яго пазітыўны пласт, які стварыў унікальнасць соцыуму, пачаў разбурацца пад уздзеяннем посткатастрофных працэсаў. З улікам гэтага аднаўленне і ўмацаванне традыцыі як фактару посткатастрофнай рэабілітацыі.

4. У посткатастрофным грамадстве адбываюцца рэзкія змены рэальнага быцця, парушэнне сацыяльна-псіхалагічных механізмаў адаптацыі асобы; фарміраванне каштоўнасных арыентацый характарызуецца хваравітасцю, зніжэннем здольнасці асобы адэкватна рэагаваць на абставіны.

Вывад пацярпелага насельніцтва з-пад дэструктыўнага ўплыву наступстваў катастрофы прадугледжвае аптымальную рэалізацыю функцый сацыяльна-культурнай дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры і мастацтва, засваенне духоўнага багацця, здабыткаў сусветнага і нацыянальнага мастацтва, рэгіянальнай культуры і традыцыйных формаў баўлення вольнага часу. Навукова-практычнай асновай стратэгіі і тактыкі выступае канцэпцыя культуратворчай асновы вольнага часу.

5. Рэалізацыя інтэлектуальна-творчага патэнцыялу чалавека ў працэсе самадзейнай творчасці выступае як знешне зададзены сродак уключэння насельніцтва ў высокія сферы культурнага асяроддзя і з'яўляецца адзінай скразной праграмай арганізацыі вольнага часу. Выкарыстанне пазітыўных культурных традыцый, звыклых формаў паскарае экстэнсіўна-інтэнсіўны рэжым уваходжання ў культурнае асяроддзе, змяншае складанасць адаптацыі насельніцтва да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці.

6. Фарміраванне індывідуальнай і грамадскай каштоўнасцей чалавека адбываецца праз яго дзейнасць па захаванні духоўных каштоўнасцей.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На працягу жыцця чалавек актыўна ўдзельнічае ў вытворчай і грамадскай дзейнасці. У посткатастрофным грамадстве па шэрагу прычын значная колькасць насельніцтва вымушана спыніць звыклую дзейнасць. Захаваць сябе як асобу ў гэтых умовах можна, калі самарэалізавацца ў працэсе мастацкай творчасці. Той, хто выяўляе абыякавасць да гэтай сферы, імкнецца захаваць сябе ў межах звыклага, штодзённага, страчвае жыццёвыя сілы, сацыяльныя і маральныя каштоўнасці, сэнс існавання.

7. Рэгуляванне эмацыянальнага стану, павышэнне сацыяльнай актыўнасці чалавека дасягаюцца сродкамі мастацтва і творчага самавыяўлення. У посткатастрофных умовах жыццядзейнасці ўзрастае патрэба чалавека ў яркім эмацыянальным свеце, захапляльных уражаннях, якія пераўзыходзяць руціннасць і заарганізаванасць штодзённага жыцця. Мастацтва здольнае адцягнуць увагу асобы ад уласных матывацый і вопыту, дазволіць індывіду адысці ад рэчаіснасці, расслабіцца ў сузіранні пачуццёва "сфакусіраванага" цэласнага і ўпарадкаванага свету.

Рэалізаваць гэтую канцэпцыю можна пры ўкараненні ў дзейнасць сацыяльна-культурных устаноў сучасных тэхналогій сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі сродкамі мастацтва і самадзейнай творчасці.

8. Сумесная скаардынаваная дзейнасць розных сацыяльна-культурных інстытутаў па выкарыстанні ў мэтах адаптацыі людзей да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці магчыма пры наяўнасці навукова абгрунтаванай мадэлі іх узаемадзеяння, стварыць якую могуць спецыялісты ў галіне арттэрапіі, бібліятэрапіі, музыкатэрапіі, харэатэрапіі і інш. Такой мадэллю могуць стаць установы культуры новага тыпу: культурна-рэабілітацыйныя цэнтры, дамы рамёстваў, грамадска-культурныя цэнтры, дамы вольнага часу, цэнтры моладзі, школы народнай творчасці, аматарскія аб'яднанні і інш.

**Асабісты ўклад суіскальніка.**

Дысертацыя ўяўляе сабой вынік шматгадовай работы суіскальніка па даследаванні сацыяльна-псіхалагічных і культуралагічных кампанентаў чарнобыльскай сацыяэкалагатэхнагеннай катастрофы. У працэсе даследавання прааналізавана агульнатэарэтычная і спецыяльная навуковая літаратура па шырокім коле праблем: каштоўнасцях асобы і іх фарміраванні ў сацыясістэмах; тэорыі сацыяльна-культурнай дзейнасці; культуры ў сістэме сацыяльнай рэгуляцыі; сацыяльных інстытутах культуры; функцыі культуры; сацыякультурных аспектах посткатастрофнага грамадства; суадносінах найноўшай тэхнагеннай культуры і традыцыйнай культуры; сутнасці посткатастрофнага развіцця соцыуму; функцыяніравання суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў посткатастрофных умовах жыццядзейнасці.

Аўтарам сабраны вялікі эмпірычны матэрыял, які характарызуе шматгранную дзейнасць прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры



па захаванні, фарміраванні, распаўсюджванні і засваенні культурных каштоўнасцей, узнаўленні індывідуальнай і грамадскай каштоўнасцей чалавека.

Дысертант прааналізаваў сучасныя тэхналогіі кампенсатарнай і рэкрэацыйнай дзейнасці сацыяльных інстытутаў замежных краін і выказаў прапановы па ўкараненні іх у дзейнасць устаноў культуры Беларусі. Дзякуючы гэтаму дысертант змог прааналізаваць праблему ў цэласным маштабе і прапанаваць сістэмны падыход для вызначэння асноўных аспектаў дзейнасці сацыякультурных інстытутаў соцыуму.

У працэсе даследавання аўтарам апублікаваны дзве манаграфіі, два дапаможнікі для работнікаў устаноў сістэмы адукацыі і культуры, а таксама шэраг навуковых артыкулаў. Дысертант удзельнічаў у рабоце некалькіх навукова-метадычных канферэнцый і семінараў па праблеме даследавання. Глыбокае і ўсебаковае навуковае асэнсаванне ролі сацыяльна-культурных інстытутаў у вырашэнні праблем посткатастрофнага развіцця дазволіла дысертанту ўкараніць у практыку некалькі мадэляў падрыхтоўкі спецыялістаў для соцыуму.

**Апрабацыя вынікаў дысертацыі.**

Матэрыялы даследавання паслужылі асновай для выступленняў з навуковымі дакладамі на міжнародных, рэспубліканскіх, рэгіянальных навуковых і навукова-практычных канферэнцыях, прысвечаных праблемам сацыяльна-культурнай дзейнасці, культуралагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў устаноў культуры і мастацтва, сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі асобы сродкамі мастацтва: "Формирование творческой личности в процессе обучения" (Мазыр, 1989 г.), "Актуальныя праблемы і навуковыя пошукі ў галіне культуры і мастацтва" (Мінск, 1994 г.), "Праблемы ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі" (Мінск, 1995 г.), "Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі" (Мінск, 1997 г.), "Навчально-виховний процес у вузі і школі та шляхі його розвитку і удосконалення" (Роўна, 1999 г.), "Современная библиотека: концепция развития" (Мінск, 1999 г.), "Трансграничное сотрудничество" (Брэст, 1999 г.), на Міжнародным форуме "Здароўе—XXI век" (Мінск, 1999 г.), на IV (1998 г.) і V (1999 г.) Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях па праблемах славянскага пісьменства і культуры (Мінск).

Сучасныя тэхналогіі сацыяльна-культурнай дзейнасці абмяркоўваліся на семінарах і нарадах у абласных упраўленнях культуры Гомельскага і Магілёўскага аблвыканкамаў, аддзелаў культуры Мазырскага, Веткаўскага, Хойніцкага і Чачэрскага раёнаў Гомельскай вобласці.

**Публікацыя вынікаў.**

Асноўныя палажэнні і вынікі даследавання знайшлі адлюстраванне ў дзвюх манаграфіях: "Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі" [Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— 160 с.], "Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме" [Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999. — 247 с.], практычным дапаможніку "Сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя насельніцтва мастацтвам" [Мінск: Бел. ун-т культуры, 1998. — 82 с.], вучэбным дапаможніку "Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме" [Мінск: Бел. ун-т культуры, 1999. — 228 с.], артыкулах і тэзісах у навуковых часопісах і зборніках. Па выніках канферэнцый надрукаваны даклады і тэзісы дакладаў. Агульны аб'ём публікацый складае 628 старонак.

**Структура і аб'ём дысертацыі.**

Дысертацыя складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, асноўнай часткі, якая ўключае чатыры главы, заключэння, спіса выкарыстаных крыніц і літаратуры, дадатка. Поўны аб'ём дысертацыі складае 247 старонак, з іх 12 старонак займае дадатак. Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры ўключае 543 найменні і займае 36 старонак.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ РАБОТЫ

**Ва ўводзінах** даецца ацэнка агульнага стану грамадства ў посткатастрофны перыяд развіцця, акрэслены асноўныя накірункі сацыяльна-эканамічнай, нарматыўна-прававой, аздараўленчай, культурнай дзейнасці дзяржавы, сусветнай супольнасці і грамадскіх арганізацый па рэабілітацыі пацярпелага ад катастрофы насельніцтва. Вызначана кола праблем, якія патрабуюць даследавання ўзаемасувязі экасацыяльнага асяроддзя і духоўнай культуры, уздзеяння прафесійнага і аматарскага мастацтва на фарміраванне духоўных каштоўнасцей, развіццё і самарэалізацыю асобы посткатастрофнага соцыуму.

**Агульная характарыстыка работы** складаецца з абгрунтавання актуальнасці тэмы, мэты і задач, аб'екта і прадмета, метадалогіі і метадаў даследавання. У ёй вызначаюцца навуковая навізна і практычная значнасць атрыманых вынікаў. Фармулююцца гіпотэза і асноўныя палажэнні, якія выносяцца на абарону. Паказаны апрабацыя вынікаў дысертацыі, колькасць апублікаваных работ, структура і аб'ём дысертацыі.

**Асноўная частка** складаецца з чатырох глаў, якія дзеляцца на параграфы.

**У першай главе "Тэарэтыка-метадалагічныя асновы дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў у посткатастрофны перыяд"** разглядаюцца тэорыі, якія раскрываюць сутнасць гістарычнага развіцця культур, заканамернасці функцыяніравання і структурнай арганізацыі соцыуму. Прадстаўнікамі класічных накірункаў і падыходаў да даследавання культуры з'яўляюцца Г.Спенсер, Э.Тайлор, А.Конт, Э.Дзюркгейм, З.Фрэйд і інш. Яны абгрунтавалі ідэю грамадскага прагрэсу і гістарычнага аптымізму, выпрацавалі асветніцка-рацыяналістычны ідэал будучага развіцця культур. Цэнтральнае месца ў іх вучэнні займаюць псіхалагічнае абгрунтаванне з'яў культуры і вызначэнне заканамернасцей развіцця грамадства, зыходзячы з псіхічных уласцівасцей індывіда. Так, Г.Спенсер, аналізуючы працэс гістарычнага развіцця грамадства, вылучыў у ім дыферэнцыяцыю і інтэграцыю. Па меркаванні Г.Спенсера, развіццё культур у цэлым ідзе ў накірунку іх інтэграцыі, аб'яднання ў пэўную цэласнасць. Ён увёў у навуковы ўжытак паняцці "структура" (грамадства, культуры), "функцыя", "культурны інстытут". Вучоны падрабязна прааналізаваў і апісаў тыпы сацыяльных інстытутаў.



<u>У першым параграфе</u> "Сутнасць і функцыі сацыяльна-культурных інстытутаў" разглядаецца працэс інстытуцыялізацыі духоўнага жыцця грамадства. Праблема інстытуцыялізацыі з'яўляецца фундаментальнай у сучасных сацыякультурных тэорыях. Т.Парсанс, Ю.Хабермас, П.Бергер, Т.Лукман і іншыя сацыёлагі лічаць, што існаванне сацыякультурых інстытутаў абумоўлена як патрэбнасцямі індывідаў, так і функцыянальнымі патрабаваннямі сацыяльных сістэм, у якіх яны займаюць даволі акрэсленае месца.

Усебаковае асэнсаванне працэсу інстытуцыялізацыі дазваляе сцвярджаць, што сацыякультурны інстытут уяўляе высокаарганізаваную сацыякультурную сістэму, якая характарызуецца ўстойлівай сацыяльнай структурай, глыбінёй інтэграванасці элементаў, разнастайнасцю, гнуткасцю і дынамічнасцю іх функцый, а значыць, і ўсёй сістэмы.

Значнае месца ў гэтым параграфе займае аналіз эндагенных і экзагенных фактараў, што абумоўліваюць развіццё сацыякультурных інстытутаў. На прыкладзе інстытутаў посткатастрофнага соцыуму раскрываюцца прычыны трансфармацыі сучасных сацыяльна-культурных інстытутаў, вызначаюцца іх сутнасць і функцыі. Пры гэтым дысертант абапіраўся на тэарэтычныя працы М.Вэбера, Э.Касірэра, Й.Хезінга і іншых культуролагаў. Ім прааналізаваны рэгулятыўная, інтэгратыўная, камунікатыўная, рэкрэацыйная і кампенсатарная функцыі сацыяльна-культурных інстытутаў.

Даследаванне тэндэнцый развіцця культурнага працэсу сведчыць: з ускладненнем сацыякультурнага асяроддзя набывае актуальнасць дзейнасць устаноў культуры і мастацтва па сацыялізацыі і трансляцыі культурнага вопыту.

У першым параграфе таксама ўтрымліваецца аналіз канцэпцыі функцыянальнасці, распрацаванай культуролагамі Р.Мертанам і Б.Маліноўскім. Абапіраючыся на вучэнне аб відавочных і латэнтных функцыях, мы вызначылі сутнасць і мэты сацыякультурнай дзейнасці ў постчарнобыльскім грамадстве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

<u>У другім параграфе</u> "Змест і асноўныя прынцыпы сацыяльна-культурнай дзейнасці" разглядаецца мнагамерны, поліметрычны характар сацыякультурных працэсаў у посткатастрофны перыяд.

Аналіз інстытуцыяльнага аспекту сацыяльнага дзеяння немагчымы без тэорыі дзейнасці, заснавальнікам якой быў Т.Парсанс. Паводле сцвярджэння гэтага культуролага, духоўныя і матэрыяльныя здабыткі людзей з'яўляюцца вынікамі грамадска абумоўленых дзеянняў на ўзроўні сацыяльнай і культурнай сістэм. У працэсе сацыяльнага дзеяння, па меркаванні Т.Парсанса, выяўляюцца існуючыя ў сацыяльных сістэмах нарматыўныя экспектацыі, якія бяруць выток з культуры і вызначаюць, што менавіта неабходна рабіць у тых ці іншых абставінах людзям у розных статусах і розных ролях.

У аснове сацыяльнай сістэмы посткатастрофнага соцыуму знаходзяцца сумесныя дзеянні людзей, абумоўленыя мэтамі іх біялагічнага і сацыяльнага самазахавання ва ўмовах грамадскага асяроддзя. Тут адносіны паміж людзьмі і сацыякультурнаай сітуацыяй уключаюць: а) адаптацыйную арыентацыю, што патрабуе вывучэння з навакольнага асяроддзя асобных аб'ектаў, іх абазначэння па якасцях, месцы і інш; б) мэтамеркаванне як імкненне да дасягнення значымых патрэбнасцей; в) ацэначную арыентацыю, якая прадугледжвае ўстанаўленне станоўчага ці адмоўнага значэння аб'ектаў з пункту гледжання чалавечых патрэбнасцей; г) узаемадзеянне сацыяльных суб'ектаў, зняцце напружанасці паміж рознымі групамі, падтрыманне дыферэнцыяцыі і стабільнасці соцыуму.

У культурнай сістэме, пазбаўленай біялагічнай абумоўленасці, культура выступае як складаная сістэма сімвалаў і нормаў, якія пастаянна змяняюцца, удасканальваюцца.

Аналіз зместу і асноўных прынцыпаў сацыякультурнай дзейнасці ў рэгіёнах, найбольш пацярпелых ад чарнобыльскай катастрофы, паказвае, што ў працэсе сумесных аднолькава накіраваных, узаемна спалучаных дзеянняў змяняюцца культурныя комплексы, склад сацыяльных груп, узаемаадносіны паміж людзьмі. У сувязі з гэтым дысертант усебакова раскрывае масавыя і індывідуальныя формы сацыякультурнай дзейнасці, яе асноўныя рысы, метады і сродкі.

<u>У трэцім параграфе</u> "Метады, формы і сродкі дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў" разглядаюцца асноўныя групы метадаў, з дапамогай якіх вырашаліся ў посткатастрофны перыяд задачы рэалізацыі культурных запатрабаванняў і інтарэсаў пацярпелага насельніцтва. Усебаковае вывучэнне і асэнсаванне зместу, відаў і формаў сацыякультурнай дзейнасці сведчаць: установы культуры і мастацтва посткатастрофнага соцыуму эфектыўна выкарыстоўвалі метады фарміравання свядомасці, жыццёвых установак і каштоўнасных



арыентацый, арганізацыі творчай дзейнасці. Безумоўна, у сацыяльна-культурнай дзейнасці нельга абысціся без культурна-асветных метадаў. Даследаванне сацыяльных тэхналогій у сферы культуры і вольнага часу паказвае, што ў постчарнобыльскім грамадстве вялікую ролю адыгрываюць метады, звязаныя з прымяненнем сродкаў мастацтва і творчага самавыяўлення.

Па сваёй прыродзе і сутнасці сацыяльна-культурная дзейнасць можа быць толькі сумеснай дзейнасцю суб'екта і аб'екта. Але для таго, каб гэта дзейнасць адбылася, яе неабходна аформіць арганізацыйна. Таму побач з метадамі ў якасці абавязковых кампанентаў сацыякультурнай дзейнасці павінны існаваць яе арганізацыйныя формы. Пагэтаму значная частка параграфа прысвечана аналізу масавых, групавых і індывідуальных формаў культурна-асветніцкай і мастацка-творчай работы.

Вывучэнне вопыту арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці ў 90-я гады дае падставы сцвярджаць, што ўстановы культуры і мастацтва Гомельшчыны і Магілёўшчыны паступова пераходзяць ад суб'ект–аб'ектнай да прынцыпова іншай, суб'ект–суб'ектнай мадэлі работы. У сувязі з гэтым задача сацыяльна-культурных устаноў заключаецца ў тым, каб знайсці шляхі, формы і спосабы аказання дапамогі чалавеку ў яго самаразвіцці, самаўдасканаленні і самарэалізацыі ў вольны час.

Суб'ектамі сацыяльна-культурнай дзейнасці назапашаны вопыт асветніцкай, выхаваўчай, культуратворчай работы з насельніцтвам рэгіёнаў, найбольш пацярпелых ад наступстваў аварыі на ЧАЭС. Дысертантам прааналізаваны сацыяльныя тэхналогіі, напрацаваныя ў сферы культуры вольнага часу, у аснове якіх ляжыць праграмна-мэтавы прынцып. Тэарэтычнае і практычнае даследаванне розных методык сацыяльна-культурнай дзейнасці сведчыць: трансфармацыя сацыякультурнага асяроддзя на значнай тэрыторыі краіны, выкліканая наступствамі чарнобыльскай катастрофы, унесла істотныя карэктывы ў традыцыйныя тэхналогіі суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

**У другой главе "Трансфармацыя сацыяльна-культурнага асяроддзя ў посткатастрофны перыяд"** даследуецца ступень дэструктыўнага ўплыву чарнобыльскай катастрофы на жыццядзейнасць індывідаў і іх супольнасцей — сем'яў, працоўных калектываў, перасяленцкіх структур, этнічных груп і інш.

<u>Першы параграф</u> "Дэструктыўны ўплыў посткатастрофных працэсаў на сацыякультурны стан соцыуму" прысвечаны аналізу сацыялагічнай тэорыі катастроф, якая дазваляе нам вылучыць індывідуальна-асобасны вектар тэарэтыка-метадалагічнага падыходу да чарнобыльскай тэхнагеннай катастрофы. Пры вывучэнні экалагічных, медыка-біялагічных, сацыяльна-эканамічных наступстваў дысертант зыходзіў з таго, што па аб'екце катастрафічнага развіцця аварыя на ЧАЭС адносіцца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

да тэхнагеннай катастрофы, а па маштабах дзеяння яна з'яўляецца глабальнай. Сацыяльная сутнасць чарнобыльскай трагедыі заключаецца ў тым, што асноўнай неўзнаўляемай ахвярай яе стаў чалавек (яго здароўе, а нярэдка і жыццё).

Паводле меркавання беларускіх і замежных катастрафолагаў, а таксама падлікаў, зробленых аўтарам, аварыя на ЧАЭС выклікала не толькі эрозію велізарнай культурна-гістарычнай прасторы Беларусі (23 % агульнай тэрыторыі рэспублікі), але і аказала ўздзеянне практычна на ўсе сферы грамадскага жыцця посткатастрофнага соцыуму. Найбольш пацярпелым рэгіёнам Беларусі аказаліся Гомельская (67,8 %) і Магілёўская (34,6 %) вобласці.

Сацыяльна-культурная сітуацыя ў 2906 населеных пунктах, дзе ў 1998 г. пражывалі 1 621 015 чалавек, моцна адрозніваецца па сацыяльных, эканамічных, культурных, псіхалагічных параметрах ад сітуацыі ў экалагічна чыстых раёнах Беларусі. Гэта дазваляе нам увесці ў адносінах да забруджаных радыенуклідамі раёнаў катэгарыяльны статус — посткатастрофны соцыум.

У разуменні соцыуму аўтар зыходзіў з таго, што вялікая, адносна ўстойлівая сукупнасць людзей характарызуецца адзінствам умоў іх жыццядзейнасці ў пэўных істотных адносінах, якія выяўляюцца ў агульнасці культуры. Соцыум у дысертацыі разглядаецца ў шырокім і вузкім сэнсах слова. У шырокім сэнсе ён выступае як макраасяроддзе, якое ахоплівае эканамічную, сацыяльную і духоўную сістэмы адносін, у вузкім — як мікраасяроддзе, непасрэднае акружэнне чалавека.

Даследаванне соцыуму ажыццяўлялася па сацыяльным вектары гуманнага ўздзеяння на асобу і сацыяльнай накіраванасці фарміруючага ўплыву. У сукупнасці ўсіх відаў соцыуму вызначальная роля належыць макраасяроддзю. Але ва ўмовах трансфармацыі грамадства ўсё большае значэнне набывае стварэнне спрыяльных для развіцця індывіда сацыяльна-псіхалагічных умоў у розных сацыяльных групах, якія адносяцца да мікраасяроддзя.

Працэс асэнсавання дэструктыўнага ўплыву вынікаў катастрофы на жыццядзейнасць людзей практычна не спыняецца: вялікая колькасць вучоных сусветнай супольнасці звяртаецца да названай праблемы і ўносіць у яе распрацоўку пэўны ўклад. Даследаваннем радыеактыўнага забруджвання прыродных экасістэм, біягеннай і абіягеннай міграцыі радыенуклідаў займаюцца беларускія вучоныя І.І.Ліштван, В.І.Парфёнаў, В.А.Іпацьеў, В.А.Кузняцоў, М.М.Пікулік, Б.І.Якушаў, Я.Ф.Канапля і інш. Медыцынскія наступствы аварыі на ЧАЭС вывучаюць Л.М.Астахава, Е.П.Дзямідчык, В.К.Зубовіч, Я.П. Іваноў, Я.Э.Кенігсберг, Г.І.Лазюк, А.М.Стажароў, Л.П.Цітоў. Сацыяльна-эканамічныя пытанні, якія ўзніклі ў выніку аварыі на ЧАЭС, даследуюцца Я.М.Александровічам, Г.М.Лычом, З.Р.Пацеевай і інш.



Значны ўклад у распрацоўку сацыяльна-псіхалагічных і дэмаграфічных наступстваў чарнобыльскай трагедыі ўнеслі Л.А.Агеева, Я.М.Бабосаў, Я.Л.Каламінскі, М.А.Крэмень, Л.А.Пергаменшчык, А.П.Ваяводскі, якія лічаць, што адмоўныя паказчыкі псіхічнага здароўя людзей выкліканы непасрэдным уздзеяннем вынікаў катастрофы на мозг і нервовую сістэму чалавека, уплывам складанага комплексу эканамічных, макра- і мікрасацыяльных вынікаў жыццядзейнасці на тэрыторыі, пацярпелай ад тэхнагеннай катастрофы.

У ходзе даследаванняў, праведзеных вучонымі Інстытута сацыялогіі НАН Беларусі, Нацыянальным інстытутам адукацыі і дысертантам у шэрагу раёнаў Гомельскай і Магілёўскай абласцей, атрыманы эксперыментальныя даныя, якія сведчаць аб тым, што ў посткатастрофным соцыуме назіраецца адметная сацыяльна-псіхалагічная і субклінічная фенаменалагічная карціна. Значная колькасць насельніцтва (75 %), якое жыве ва ўмовах пастаянна павышанага радыяцыйнага фону, знаходзіцца ў стане нервова-псіхічнага напружання ці стрэсу ў сувязі з вынікамі чарнобыльскай аварыі. Асаблівасцямі стрэсагеннага ўздзеяння чарнобыльскай катастрофы, па нашым меркаванні, з'яўляюцца незвычайныя ўстойлівасць, працягласць і пастаянства ўздзеяння яе вынікаў на значныя па колькасці людзей сацыяльныя супольнасці.

У другім параграфе "Сацыяльна-псіхалагічныя і культуралагічныя аспекты чарнобыльскай катастрофы" прааналізаваны асноўныя кампаненты комплекснага стрэсу, якім з'яўляецца аварыя на ЧАЭС, і іх стрэсагеннае ўздзеянне на людзей, якое выклікае ў насельніцтва соцыуму псіхасаматычныя расстройствы. Выяўлена, што масавы сацыяльна-радыеэкалагічны стрэс выклікае некалькі тыпаў адаптацыйных сіндромаў. Найбольш пашыраныя з іх: павышаная саматызацыя трывожнага чакання; засяроджванне на непрыемных перажываннях, якія траўміруюць псіхіку; абясцэньванне патрэбнасцей (так званая сацыяльна-псіхалагічная апатыя).

Вынікі даследаванняў сведчаць: карэннае змяненне ўмоў жыццядзейнасці чалавека ў посткатастрофным соцыуме істотна адбілася на структуры патрэб людзей, іх каштоўнасных арыентацыях і іншых якасцях асобы. Змяншэнне практычнай значнасці культурных інтарэсаў і патрэб у сваю чаргу нарадзіла шэраг праблем маральнага парадку. Атрыманыя намі падчас сацыялагічных даследаванняў даныя паказваюць, што ў 90-я гады адбыліся ўражвальныя змены ў сферы каштоўнасных арыентацый моладзі. Рэспандэнты даследуемага соцыуму выказалі думку, што ў грамадстве значна абясцэніліся такія вышэйшыя маральныя каштоўнасці, як годнасць чалавека, справядлівасць, творчасць, каханне, інтэлект.

На наш погляд, асоба, што фарміруецца ў посткатастрофных умовах жыццядзейнасці, мае вострую патрэбу ў сацыяльна-псіхалагічнай

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

рэабілітацыі, у добра арганізаванай рэадаптацыі да новых умоў існавання. Да таго ж з дапамогай рэабілітацыі можна вярнуць чалавека ў рэчышча сваёй культуры і асабістых відаў дзейнасці, з якіх ён выключаецца па меры фарміравання ў яго псіхалагічнага стрэсу, радыяфобіі.

Аналіз практычнага вопыту арганізацыі псіхалагічнай рэабілітацыйнай дапамогі ахвярам катастрофы дае падставы сцвярджаць, што дзяржавай і грамадствам нашай краіны яшчэ не створана эфектыўная сістэма сацыяльна-псіхалагічнай дапамогі насельніцтву, пацярпеламу ад чарнобыльскай катастрофы. Амаль не выкарыстоўваюцца ў гэтых мэтах магчымасці суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці.

Трэці параграф "Асаблівасці трансфармацыі і развіцця інфраструктуры культуры ў посткатастрофным грамадстве" ўтрымлівае багаты тэарэтычны і фактычны матэрыял, які адлюстроўвае сацыядынаміку культуры ў постчарнобыльскі перыяд.

У вывучаемы перыяд у інфраструктуры культуры Беларусі існавала 11,5 тыс. бібліятэк, 4246 клубаў, 148 музеяў, 26 тэатраў, 13 канцэртных устаноў. У рэспубліцы ў 1997 г. мелася 8208 вакальна-харавых, 3630 тэатральна-драматычных, 2548 харэаграфічных, 926 інструментальных самадзейных калектываў.

Вывучэнне дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў у краіне, у тым ліку і ў посткатастрофным соцыуме, сведчыць аб тым, што крызісная сітуацыя, якая пачала складвацца ў Беларусі з канца 80-х гадоў і абвастрылася пасля тэхнагеннай катастрофы, істотна паўплывала на культурную дзейнасць.

Аналіз сацыяльна-культурнай сітуацыі апошняга дзесяцігоддзя XX ст. паказвае, што ў гэты перыяд назіралася тэндэнцыя да скарачэння культурнай актыўнасці насельніцтва соцыуму. На наш погляд, гэта абумоўлена мінімальнай дзяржаўнай падтрымкай галіны культуры, неразвітасцю недзяржаўных крыніц матэрыяльнага забеспячэння культуры і мастацтва. Працэсы трансфармацыі грамадства спалучаліся са зменай прынцыпаў і функцый суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці, што таксама значна ўскладняла функцыяніраванне устаноў культуры. Даследаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, формаў і метадаў культурна-асветніцкай работы сацыяльна-культурных інстытутаў соцыуму сведчыць: для іх звыклымі сталі пастаянны недахоп сродкаў для ажыццяўлення культурнай дзейнасці, цяжкасці тэхнічнага пераабсталявання, праблемы падрыхтоўкі кадраў, адпаведных сучаснай сітуацыі.

У працэсе даследавання высветлілася, што толькі 64 % устаноў культуры краіны мелі спецыяльна пабудаваныя памяшканні, а 17 % патрабавалі капітальнага рамонту, толькі 22% бібліятэк мелі тэлевізары, 17 % – магнітафоны, 1,3 % – відэамагнітафоны, 1,0 % – камп'ютэры. Не лепшая сітуацыя ва ўстановах клубнага тыпу: 34 % клубаў не мелі



музычных інструментаў, 58 % – тэлевізараў, 49 % – кінаўстановак, 53 % – камплектаў сцэнічных касцюмаў.

Аналіз стану суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці паказаў, што глыбокі эканамічны крызіс і сацыяльна-эканамічныя наступствы катастрофы выклікалі значнае змяненне сеткі аб'ектаў культуры. У даследуемы перыяд у посткатастрофным соцыуме зачыніліся 309 бібліятэк, 724 установы клубнага тыпу.

Глыбокае і ўсебаковае даследаванне культурна-асветніцкай дзейнасці сацыяльна-культурных устаноў паказала, што адначасова з негатыўнымі працэсамі адбываюцца пазітыўныя змены ў сацыяльна-культурнай сферы. У краіне распачаўся пошук адпаведнай сістэмы каштоўнасцей, іх ідэйна-сэнсавага зместу і новых падыходаў да культурнай дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры. Паўсюдна ствараюцца ўстановы новага тыпу: цэнтры народнай творчасці, фальклору і нацыянальнай культуры, дамы рамёстваў і традыцыйных відаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, цэнтры культуры і вольнага часу, аматарскія аб'яднанні і клубы па інтарэсах.

На наш погляд, ім належыць вядучая роля ў трансляцыі і засваенні насельніцтвам духоўных каштоўнасцей, вывучэнні і падтрымцы культурных, нацыянальных традыцый, інтарэсаў, рэадаптацыі насельніцтва да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці.

**У трэцяй главе "Вытворчасць, трансляцыя і засваенне духоўных каштоўнасцей – важнейшыя функцыі дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва ў посткатастрофным грамадстве"** разглядаюцца пастаянныя, асноўныя функцыі, уласцівыя большасці сацыяльна-культурных інстытутаў. Вынікі даследавання даюць падставы лічыць, што разгледжаныя ў першым параграфе "Прафесійнае мастацтва як сродак фарміравання каштоўнасных арыентацый" функцыі з'яўляюцца асноватворнымі ў культуры. Яны звязваюць у адно цэлае ўсе астатнія функцыі культурнай дзейнасці. Іх рэалізацыя ў комплексе забяспечвае захаванне і развіццё і чалавека, і грамадства. Такі падыход да функцыянальнай структуры культуры дазваляе выявіць у ёй вытворчасць духоўных каштоўнасцей, іх засваенне. У гэтым працэсе фарміруецца асоба і адбываецца вяртанне ёю набытых духоўных сіл у грамадскую практыку. У час нашага даследавання мы назіралі (і па магчымасці карэкціравалі), як складваліся і рэалізоўваліся названыя функцыі ў дзейнасці сацыяльна-культурных устаноў Беларусі, для якіх асветніцкая работа, духоўнае развіццё чалавека, рэалізацыя ім сваёй родавай сутнасці з'яўляюцца асноўнымі мэтамі і задачамі.

Ва ўмовах глабальных сацыяльных зрухаў культура адыгрывае асабліва важную ролю. Яна садзейнічае ўдасканаленню жыцця чалавека шляхам падтрымкі традыцый, распаўсюджвання ведаў, ідэалаў,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

каштоўнасцей. Як паказала даследаванне, тэатральна-відовішчныя, канцэртныя прадпрыемствы і ўстановы культуры краіны і посткатастрофнага соцыуму імкнуцца ва ўмовах сацыяльна-эканамічнага крызісу, абвостранага наступствамі чарнобыльскай трагедыі, забяспечыць паўнавартаснае духоўнае жыццё соцыуму і асобы, асноватворную ролю прафесійнага і самадзейнага мастацтва ў развіцці і самаарганізацыі чалавека, сцвярджэнні яго годнасці, высокіх эталонаў мастацкай і маральнай культуры.

Аналіз мастацкіх твораў, прысвечаных наступствам чарнобыльскай трагедыі, сведчыць: адны творцы формай імкнуліся зменшыць жудаснае значэнне бяды, эстэтызаваць загану, а ў іншых выпадках, наадварот, з дапамогай выразнай мастацкай мовы (формы) адчувальна прадстаўлялі сутнасць трагедыі беларускага народа. У трэцяй главе дысертацыі звяртаецца ўвага на творчасць прафесійных мастакоў М.Савіцкага, Г.Вашчанкі, В.Шматава, У.Кожуха, В.Барабанцава, А.Фралянкова, У.Гардзеенкі, В.Шкарубы, М.Цудзіка, У.Уродніча і іншых, прысвечаную чарнобыльскай тэме. Значная частка даследавання знаёміць з творчай дзейнасцю мастакоў посткатастрофнага соцыуму. Усе яны ў межах свайго вопыту і майстэрства імкнуліся паказаць злавесныя перамены, што пачаліся ў прыродзе і душах людзей пад уплывам наступстваў трагедыі.

Адметную ролю ў сцвярджэнні Дабра, Ісціны, Характва адыгрывае тэатральнае мастацтва, якое актыўна і плённа ўздзейнічае на фарміраванне грамадскай думкі вакол пэўных з'яў і тэндэнцый, дапамагае чалавеку ў пераадоленні цяжкасцей быцця. Мастацтва здольнае дапамагчы працэсу самаідэнтыфікацыі чалавека, зняццю глыбокіх унутраных праблем, дзякуючы ўменню выказваць інтуітыўна дасягаемы жыццёвы парыў, непасрэдна выяўляць субстанцыю быцця.

У сувязі з гэтым у трэцяй главе дысертацыі высвятляецца роля тэатральнай культуры ў фарміраванні ў насельніцтва чарнобыльскай зоны эстэтычных патрэбнасцей, выхаванні належнага ўзроўню эстэтычнага пачуцця і эстэтычнага ўспрымання, цягі да творчасці.

Вывучэнне тэндэнцый развіцця выяўленчага, тэатральнага і музычнага мастацтваў дазволіла дысертанту выказаць меркаванне аб тым, што, нягледзячы на наяўнасць шматлікіх складаных праблем і супярэчнасцей, нявырашаных задач, першаснымі для прафесійнага мастацтва 90-х гадоў з'яўляліся сфера духоўнасці, захаванне маральных каштоўнасцей, традыцыйных для беларускага народа, яго нацыянальнага менталітэту.

Эфектыўным сродкам далучэння насельніцтва вывучаемага соцыуму да культуры, эстэтычнага, маральнага выхавання, гарманічнага развіцця чалавека з'яўляецца самадзейная мастацкая творчасць. Аналізу псіхалагічнага ўздзеяння мастацкай творчасці на асобу прысвечаны другі параграф "Рэалізацыя інтэлектуальна-творчага патэнцыялу асобы ў



працэсе самадзейнай мастацкай творчасці", у якім разглядаецца сістэма рэгулявання мастацкай творчасці насельніцтва, прадстаўленая рознымі відамі і формамі дзейнасці, узроўнямі і ступенямі каштоўнасцей. Яна ахоплівае дзейнасць розных устаноў культуры: дзяржаўных, прафсаюзных, ведамасных, а таксама камерцыйных, сістэм дамоў адпачынку, дзіцячых устаноў. Суб'ектамі гэтай дзейнасці з'яўляюцца аматарскія гурткі, суполкі, разнастайныя грамадскія аб'яднанні і ўстановы культуры. Даследаванне мастацкай самадзейнасці з пазіцый тэорыі культуры дае падставы сцвярджаць, што яна з'яўляецца састаўной часткай духоўнай культуры грамадства, спрыяе яе ўзбагачэнню і дэмакратызацыі, а таксама фарміраванню сістэмы вытворчасці і распаўсюджванню эстэтычных каштоўнасцей. Самадзейную творчасць можна лічыць і сацыяльна-педагагічнай сістэмай, якая функцыянiруе ва ўмовах вольнага часу і скіравана на маральна-эстэтычнае выхаванне людзей шляхам далучэння іх да непасрэднай актыўна-творчай мастацкай практыкі.

Матэрыялы праведзенага намі сацыялагічнага даследавання сведчаць: для значнай часткі насельніцтва вольны час стаў адной з важнейшых жыццёвых каштоўнасцей. Так, 2/3 рэспандэнтаў адзначалі, што яны мелі ад двух да пяці гадзін вольнага часу штодня. Аднак 66,4 % апытаных адказалі, што гэты час выкарыстоўваўся імі не заўсёды рацыянальна.

Аналіз дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў рэспублікі і посткатастрофнага соцыуму дазваляе ўпэўніцца ў тым, што праблемы стварэння ўмоў самаразвіцця культурнай сферы вольнага часу, пошук новых падыходаў да вызначэння асноў культурнай палітыкі ў гэтай сферы вырашаліся і вырашаюцца з улікам сацыяльна-культурных асаблівасцей рэгіёна, інтарэсаў і культурных запатрабаванняў розных катэгорый насельніцтва, культурнага патэнцыялу соцыуму.

У дзейнасці ўстаноў культуры галоўная роля адводзілася падтрымцы і развіццю розных формаў аматарскай творчасці. У працэсе даследавання намі падлічана, што колькасць гурткоў і калектываў мастацкай самадзейнасці, якія існавалі ў 1997 г. у Гомельскай і Магілёўскай абласцях, дасягнула 5070 адзінак. Найбольш распаўсюджанымі жанрамі мастацкай самадзейнасці з'яўляюцца харавое, музычна-інструментальнае, харэаграфічнае і тэатральнае мастацтва.

Акрамя разгледжаных відаў і жанраў аматарскай творчасці, у даследуемы перыяд інтэнсіўна развіваліся аматарскія аб'яднанні, гурткі, майстэрні і іншыя самадзейныя фарміраванні. Так, у 1997 г. іх налічвалася на Гомельшчыне і Магілёўшчыне 2394 адзінкі, у іх бралі ўдзел 92 604 чалавекі. Самадзейныя аб'яднанні значна ўплывалі на развіццё сутнасных сіл чалавека — яго індывідуальнасці, самакаштоўнасці і самабытнасці.

Вывучэнне матываў аб'яднання людзей у аматарскія суполкі, іх культурных і сацыяльных запатрабаванняў паказала, што аматарскія

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аб'яднанні ўяўляюць згуртаванні людзей, звязаных агульнымі інтарэсамі і патрэбамі, аднымі і тымі ж духоўнымі ці іншымі каштоўнасцямі, каштоўнаснымі арыентацыямі, сацыяльнымі ўстаноўкамі і матывамі творчай дзейнасці.

Аматарскія аб'яднанні і ўстановы новага тыпу, па нашым меркаванні, маюць добрыя перадумовы для пераўтварэння іх ва ўстановы фарміравання адпаведных зносін паміж людзьмі, самасцвярджэння асобы.

У ходзе даследавання ў трэцім параграфе "Захаванне і развіццё сацыяльна-культурнымі інстытутамі здабыткаў рэгіянальнай культуры і традыцыйных формаў вольнага часу" прааналізавана дзейнасць сацыяльна-культурных інстытутаў па захаванні, развіцці і папулярызацыі здабыткаў рэгіянальнай культуры Беларускага Палесся і Падняпроўя, якая вызначаецца ярка выяўленай адметнасцю, адрозніваецца ад мастацтва іншых рэгіёнаў. Чарнобыльская катастрофа стварыла рэальную пагрозу страты помнікаў матэрыяльнай і духоўнай нацыянальнай культуры. У зоне радыяцыйнага забруджвання апынуліся 362 помнікі археалогіі часоў неаліту, бронзавага і жалезнага вякоў, ранняга феадалізму, 1283 помнікі гісторыі, 97 помнікаў архітэктуры.

У гэтым параграфе падрабязна прааналізавана дзейнасць навукова-даследчых устаноў, ВНУ, творчых саюзаў і арганізацый па вывучэнні і захаванні традыцый народнай і самадзейнай мастацкай творчасці.

Сутнасць і прырода, гістарычнае прызначэнне і роля традыцыйнага народнага мастацтва раскрываюцца намі праз працэс дыялогу і сістэмы ўзаемадзеяння паміж традыцыйнай культурай і сучаснай культурнай дзейнасцю ва ўсіх яго праявах, разнавіднасцях, формах.

На наш погляд, змест культурнай палітыкі ў дачыненні да традыцыйнага народнага мастацтва раёнаў, якія трапілі ў экалагічную катастрофу, не вычэрпваецца вывучэннем і захаваннем яго скарбаў. Сутнасць дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў заключаецца ў засваенні здабыткаў рэгіянальнай культуры, у стварэнні ўмоў для яе самаразвіцця.

У сувязі з гэтым дысертантам праведзены грунтоўны аналіз рэгіянальных мэтавых праграм, скіраваных на развіццё традыцыйнай культуры. Праграмы "Адраджэнне традыцыйнай мастацкай культуры Палесся", "Беларускі ручнік", "Спадчына" і "Родная мова" садзейнічалі актывізацыі дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў па арганізацыі навуковых даследаванняў, стварэнні сістэмы пераемнасці фальклорнага і мастацка-рамесніцкага вопыту, папулярызацыі і пашырэнні народнага мастацтва.

Вынікі даследавання даюць падставы сцвярджаць, што дамы рамёстваў, школы народнай творчасці, цэнтры рамёстваў і іншыя ўстановы культуры новага тыпу асаблівую ўвагу надаюць спосабам



навучання і засваення традыцыі, яе формам існавання. На Гомельшчыне і Магілёўшчыне існуюць фальклорныя гурты, якія засвойваюць народныя спевы, танцы, ігру на музычных інструментах не шляхам навучання, а праз вусную мову або імітацыю. І гэта нават не столькі навучанне традыцыі, колькі спроба арганічнага ўваходжання ў яе.

Аналіз развіцця музычных калектываў паказвае, што ўзбуджэнню цікавасці да нацыянальнай культуры, адраджэнню і развіццю рэгіянальнай харэаграфічнай і музычнай спадчыны садзейнічаюць шматлікія конкурсы, агляды і фестывалі. Сапраўднай творчай лабараторыяй нацыянальна-духоўнай культуры былі фестывалі народнага танца "Палескі карагод", "Пярэзвы", "Сожскі карагод", "Беларуская полька". У 90-я гады праводзіліся таксама фестывалі народнай музыкі "Іграй, гармонік", "Звіняць цымбалы і гармонік", "Траецкі фэст", "Жыцень", "Беларусь – мая песня" і інш.

У дысертацыі даследавана дзейнасць устаноў культуры па адраджэнні ў традыцыйным напрамку свят народнага календара. У культурным кантэксце свята разглядаецца намі як частка арганізаванага і прадвызначанага жыцця грамадства, яго слаёў, груп, як форма рэгуляцыі іх дзейнасці. Святочнае дзейства ўзнаўляе ў памяці групы або грамадства ў цэлым вышэйшыя каштоўнасці, далёкія ад штодзённага жыцця, з якімі звязаны сэнс існавання асобы, ідэнтычнасць грамадства.

Менавіта таму ў час свята адбываецца канцэнтрацыя культурнага жыцця і мастацкай творчасці. Правядзенне яго ахоплівае архітэктурнае і дэкаратыўнае афармленне тэатралізаваных дзей, святочную драматургію, паэзію і прозу, музычныя мерапрыемствы, відовішчы і працэсіі, конкурсы і спаборніцтвы. Грамадзянскія і асабліва народныя святы ўключаюць не толькі ўрачыста-сур'ёзныя, але і гульнявыя моманты.

Абагульненне работы сацыяльна-культурных інстытутаў па арганізацыі і правядзенні свят сведчыць: у народныя святы, абрады, звычаі шырока ўліваліся гістарычныя, духоўна-царкоўныя асновы. Яны набывалі традыцыйныя элементы, якія маюць глыбінныя карані, што прараслі і прарастаюць у нашу сучаснасць з язычніцтва праз стагоддзі хрысціянізацыі.

**Чацвёртая глава "Новыя тэхналогіі кампенсатарнй дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў"** прысвечана аналізу сучасных тэхналогій сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі людзей з псіхічнымі расстройствамі сродкамі мастацтва і творчай дзейнасці.

Псіхагенныя расстройствы, якія ўзніклі адначасова ў вялікай колькасці людзей у выніку чарнобыльскай катастрофы, патрабавалі ўдасканалення традыцыйных і распрацоўкі новых мадэляў псіхасацыяльнай работы. Даследаваннем псіхатэрапеўтычных метадаў і сродкаў эфектыўнага ўздзеяння на людзей з посткатастрофным сіндромам

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

займаліся і займаюцца многія вучоныя нашай краіны і замежжа. Праблемы лячэння псіхічных расстройстваў, выкліканых нечакана ўзніклымі псіхатраўматычнымі фактарамі, распрацоўвалі І.В.Александровіч, В.А.Абабкаў, А.Менегеці, А.М.Мілер, Л.М.Кроль, Е.А.Міхайлаў, У.Ю.Заўялаў, Б.Д.Карвасарскі, М.Е.Бурно, В.Е.Франкл і інш.

Чарнобыльская катастрофа выклікала ў беларускіх вучоных павышаную цікавасць да асобасна арыентаванай псіхатэрапіі. Навуковымі і практычнымі даследаваннямі па тэме "Сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя дзяцей і падлеткаў" займаюцца Я.Л.Каламінскі, М.А.Крэмень, А.І.Ляўко, А.А.Аладзін, Л.А.Пергаменшчык, Л.М.Рожына, І.А.Фурманаў і інш. Імі вылучалася філасофска-псіхалагічная мадэль псіхатэрапіі, асноўнай мэтай якой з'яўляецца не столькі лячэнне ад псіхалагічных расстройстваў, колькі дапамога ў працэсе станаўлення свядомасці асобы, дзе псіхатэрапеўт выступае спадарожнікам хворага, яго сябрам і настаўнікам.

Даследаванне псіхалагічнай, сацыяльнай, псіхатэрапеўтычнай службаў у Беларусі паказала, што ва ўмовах іх неразвітасці ўзрастае значэнне тэрапіі творчым самавыяўленнем і іншымі метадамі, звязанымі з творчымі перажываннямі. Наша абгрунтаванне неабходнасці сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі людзей з постчарнобыльскім сіндромам сродкамі мастацтва абапіраецца на разуменне ролі літаратуры, мастацтва, народнай творчасці ў жыцці сучаснага чалавека. Мастацкая культура здольная адцягнуць увагу асобы ад уласных матывацый і вопыту, дазволіць індывіду расслабіцца ў сузіранні пачуццёва "сфакусіраванага" цэласнага і ўпарадкаванага свету.

<u>У першым параграфе</u> "Бібліятэрапія як метад рэадаптацыі насельніцтва да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці" прааналізаваны сучасныя накірункі заходнееўрапейскай псіхатэрапіі, прасякнутай канцэпцыямі неклінічнага, псіхадынамічнага характару. Экзістэнцыяльна-гуманістычная тэрапія абапіраецца на вучэнне аб свабодным развіцці асобы, адказнасці чалавека за фарміраванне ўласнага ўнутранага свету і выбару жыццёвага шляху. Прадстаўнікі гэтага накірунку ў псіхатэрапіі вылучаюць тры групы каштоўнасцей: каштоўнасці творчасці, каштоўнасці перажывання і каштоўнасці адносін. Прыярытэт належыць каштоўнасцям творчасці, асноўным спосабам рэалізацыі якіх з'яўляецца творчая дзейнасць. Мэтай рэабілітацыі творчым самавыяўленнем з'яўляецца не проста вярнуць хворага да працы, але, абапіраючыся на асобу хворага, аднавіць, захаваць яго індывідуальную і грамадскую каштоўнасць. У сувязі з гэтым псіхатэрапеўтамі выкарыстоўваюцца розныя прыёмы лячэння натхненнем, культурай. Сучаснымі прыёмамі тэрапеўтычнага самараскрыцця ў творчасці з'яўляюцца гештальттэрапія, арттэрапія, музыкатэрапія, тэрапія літаратурнай творчасцю, этнатэрапія і інш.



Вывучэнне дзейнасці арттэрапеўтычных, музакатэрапеўтычных цэнтраў, спецыялізаваных бібліятэк Германіі, Даніі і Польшчы сведчыць аб тым, што лячэннем творчай дзейнасцю там займаюцца ў асноўным не ўрачы, а спецыяльна падрыхтаваныя бібліятэрапеўты, арттэрапеўты, музыкатэрапеўты і інш. Неклінічныя, дадатковыя формы тэрапіі творчай дзейнасцю набылі ў Заходняй Еўропе, ЗША і іншых краінах свету масавы характар.

Такім чынам, у свеце назапашаны багаты практычны вопыт сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі людзей з псіхічнымі расстройствамі сродкамі мастацтва. Ён, на наш погляд, можа быць адаптаваны ўстановамі культуры да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці.

Праца сацыякультурных інстытутаў у посткатастрофны перыяд была скіравана на ўключэнне прафесійнага мастацтва, самадзейнай мастацкай творчасці ў сацыяльна-псіхалагічную рэабілітацыю насельніцтва забруджаных тэрыторый. Даследаванне гэтай дзейнасці дае падставы сцвярджаць, што ўстановы культуры і мастацтва ў сваёй культурна-асветніцкай рабоце выкарыстоўвалі традыцыйныя формы і метады, якія не заўсёды эфектыўна ўздзейнічалі на працэс аднаўлення асобаснага і сацыяльнага статуса ў пацярпелага насельніцтва.

Сярод суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці бібліятэкі адносяцца да самых шматлікіх устаноў культуры. У Гомельскай і Магілёўскай абласцях у 1997 г. існавала 1565 гарадскіх і вясковых бібліятэк, якія выконвалі шэраг сацыяльных функцый. Клініка-бібліятэрапеўтычныя даследаванні беларускіх і замежных вучоных паказалі, што ў посткатастрофным соцыуме ўзрастае кампенсатарная функцыя публічных бібліятэк. Даследаванне дзейнасці бібліятэк сведчыць: ва ўмовах масавага абслугоўвання насельніцтва і неразвітасці бібліятэрапеўтычнага метаду ў даследуемым соцыуме адбываецца выкарыстанне бібліятэрапіі як бібліятэказнаўчага аспекту. Мэтанакіраванае чытанне ў гэтым выпадку праследавала аздараўленчыя, выхаваўчыя, псіхалагічныя, сацыяльныя, этычныя і эстэтычныя задачы. Яно з'яўляецца адной з частак рэабілітацыі, што дапамагае дэзадаптаванаму чытачу перапрацаваць і асэнсаваць узніклыя праблемы, падтрымаць яго ў перыяд рэадаптацыі, пазбавіцца ад непатрэбнага самааналізу, навязлівых думак.

Вывучэнне бібліятэрапеўтычнай практыкі дае падставы сцвярджаць, што рэфлексія, выкліканая мастацкім творам, нярэдка становіцца крыніцай абуджэння сумлення, фарміравання новага светаадчування, новых крытэрыяў ацэнкі жыццёвых з'яў і ўчынкаў людзей. Паўната адчуванняў, адкрыцці, зробленыя ў працэсе чытання і літаратурнай творчасці, выклікаюць радасць, якую можна назваць мастацкай асалодай. Натхненне, адухаўленне, напоўненасць выклікаюць жаданне падзяліцца імі з іншымі, даюць імпульс да ўласнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Вывучэнне бібліятэрапеўтычнай сітуацыі ў заходнееўрапейскіх краінах сведчыць: для арганізацыі і правядзення эфектыўнай бібліятэрапеўтычнай дзейнасці патрэбныя высокакваліфікаваныя кадры. Бібліятэкару, які працуе ў посткатастрофным соцыуме, неабходна мець добрую падрыхтоўку ў галіне санітарнай асветы, валодаць праблемамі, звязанымі з псіхалогіяй унушэння. Асабліва гэта тычыцца бібліятэкараў лячэбных устаноў.

Намі прааналізаваны ўзровень адукацыі супрацоўнікаў дзяржаўных публічных бібліятэк, якія ўваходзяць у сістэму Міністэрства культуры. З 9422 супрацоўнікаў бібліятэк вышэйшую бібліятэчную адукацыю ў 1997 г. мелі 2827 чалавек (30 %), сярэднюю спецыяльную адукацыю — 3921 чалавек (41 %).

Сацыялагічныя апытанні, праведзеныя ў ходзе даследавання, выявілі, што бібліятэкары не атрымліваюць такіх ведаў у перыяд павышэння кваліфікацыі ў БелІПК. У выніку супрацоўнікі публічных бібліятэк не маюць ведаў, уменняў і навыкаў, патрэбных для вядзення прафесійнай рэабілітацыйнай работы метадам мэтанакіраванага чытання. Гэтая дзейнасць вялася ў асноўным на інтуітыўным узроўні.

Такім чынам, аналіз дзейнасці публічных і спецыяльных бібліятэк у Гомельскай і Магілёўскай абласцях паказаў, што бібліятэрапія як метад кіравання чытаннем людзей з посттраўматычным стрэсам знаходзіцца на этапе станаўлення і таму патрабуе сур'ёзных намаганняў сацыяльных інстытутаў.

Даследаванне метадаў і сродкаў мэтанакіраванага ўздзеяння на псіхалагічны і саматычны стан чалавека, вынікі якога ўтрымліваюцца ў другім параграфе "Узнаўленне індывідуальнай і грамадскай каштоўнасці чалавека сродкамі мастацтва і творчага самавыяўлення", паказала, што музыкатэрапія займае сярод іх асобнае месца.

Спецыфічнай уласцівасцю музыкі з'яўляецца здольнасць свабодна, непасрэдна, ненавязліва і разам з тым вельмі моцна ўздзейнічаць на асобу. Без якога-небудзь намеру і знешняга штучнага ўмяшання музыка можа выклікаць глыбокія рэакцыі ў слухачоў. Музычнае мастацтва ўплывае не толькі на эмацыянальнае і эстэтычнае выхаванне, але і на пазнанне, на эстэтычнае пачуццё і паводзіны чалавека.

Лячэбнае ўздзеянне музыкі вынікае не толькі з магчымасці невербальнай, разнастайнай па форме выяўлення эмацыянальнай сувязі музыкі з чалавекам, але і са спецыфічнага ўздзеяння асноўных элементаў музыкі: рытму, мелодыі і гармоніі, якія складаюць аснову музыкі і пранікаюць у глыб псіхікі.

Шырокія магчымасці лячэбнага ўздзеяння музыкі на арганізм чалавека паслужылі імпульсам для ўзнікнення новага навуковага накірунку – музыкатэрапіі як аднаго з лячэбна-выхаваўчых метадаў. Пад



музыкатэрапіяй разумеюць псіхатэрапеўтычны метад, які выкарыстоўвае музычнае мастацтва ў якасці лячэбнага сродку.

У чацвёртай главе дысертацыі падрабязна прааналізаваны разнастайныя формы дзейнасці музыкатэрапеўтычных цэнтраў, якія існавалі ў краінах Заходняй Еўропы, вопыт работы беларускіх музыкатэрапеўтаў, патэнцыяльныя магчымасці ўстаноў культуры і мастацтва ў выкарыстанні музыкатэрапеўтычных метадаў з мэтамі эфектыўнага ўздзеяння на псіхафункцыянальны стан дэзадаптаваных людзей.

Вывучэнне арттэрапеўтычнай тэорыі і практыкі дазволіла нам прыйсці да высновы аб тым, што вялікія рэабілітацыйныя магчымасці маюць прафесійныя і аматарскія тэатры, тэатральна-драматычныя гурткі.

Сацыяльна-псіхалагічны інструментарый тэатральнага мастацтва мае значныя перавагі ў параўнанні з іншымі жанрамі. Мастацкае слова, дзея, акумуляванае на сцэне жыццё, якое да таго ж лёгка атаясамліваецца з уласным вопытам, вельмі ўражвальна ўздзейнічаюць на чалавека. Той, хто прыйшоў на спектакль, імкнецца не толькі атрымаць "маральны ўрок", але перш за ўсё пазбавіцца ад комплексаў, якія адмоўна ўплываюць на яго псіхафізічны стан.

Дысертантам усебакова вывучаны вопыт выкарыстання тэатральнага мастацтва як лячэбнага, псіхатэрапеўтычнага метаду айчыннымі і замежнымі клініцыстамі і работнікамі ўстаноў культуры. Глыбокае асэнсаванне гэтага вопыту дае аўтару магчымасць прыйсці да высновы аб тым, што ў посткатастрофным соцыуме цэнтры тэатратэрапіі могуць ствараццa пры прафесійных, народных тэатрах, клубах, Дамах культуры, навучальных установах культуры і мастацтва.

У дысертацыі зроблена спроба прааналізаваць такія творчыя віды сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі, як арттэрапія, гештальттэрапія, харэатэрапія. Вывучэнне эфектыўнасці ўздзеяння на людзей з псіхагеннымі расстройствамі твораў мастацтва паказала, што дабратворна ўплываюць на іх псіхафункцыянальны стан не толькі сузіранне твораў выяўленчага мастацтва, але і яшчэ ў большай ступені непасрэдны ўдзел у самадзейнай выяўленчай творчасці.

Аналіз традыцыйных і сучасных відаў мастацкай творчасці сведчыць: у Гомельскай і Магілёўскай абласцях былі высока развіты ганчарства, мастацкая апрацоўка дрэва, стварэнне вырабаў з саломкі, лазы, бяросты, паперы, выкананне роспісаў па шкле, тканіне, дрэве, а таксама ткацтва, вышыўка, апрацоўка каляровых і чорных металаў. У даследуемым рэгіёне праводзілася работа па аб'яднанні народных майстроў, мастакоў-аматараў у клубы, майстэрні, аматарскія гурткі, дамы рамёстваў і цэнтры промыслаў. Толькі ў Гомельскай вобласці ў 1997 г. існавала 17 устаноў новага тыпу, у якіх асвойваліся традыцыйныя віды дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, мэтам і задачам арттэрапіі і гештальттэрапіі найбольш адпавядалі дамы (цэнтры) рамёстваў, якія мелі прыстасаваныя да творчай дзейнасці будынкі, класы, майстэрні для правядзення групавой дзейнасці. Разгалінаваная сетка ўстаноў, дзе праходзілі заняткі па асваенні традыцыйных і сучасных відаў мастацкай творчасці, стварала рэальную магчымасць выкарыстання сацыяльна-культурнымі інстытутамі арттэрапеўтычных метадаў ў рэабілітацыйных мэтах.

Даследаванне рэкрэацыйнай і кампенсатарнай дзейнасці ўстаноў культуры і мастацтва паказала, што імі выкарыстоўваліся асобныя элементы бібліятэрапіі, арттэрапіі, гештальттэрапіі і іншых творчых відаў рэабілітацыі пацярпелага ад радыяцыйнага ўздзеяння насельніцтва. Аднак гэтая работа ажыццяўлялася без глыбокага ведання сучасных тэхналогій, спосабаў і метадаў сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі сродкамі мастацтва і творчай дзейнасці.

Нізкая эфектыўнасць дзейнасці сацыяльна-культурных інстытутаў, скіраваная на аднаўленне здольнасці да сацыяльнага функцыяніравання дэзадаптаванага насельніцтва посткатастрофнага соцыуму, тлумачыцца практычнай адсутнасцю ў гэтым соцыуме спецыяльна падрыхтаваных кадраў для рэабілітацыі сродкамі мастацтва.

У трэцім параграфе "Фарміраванне кадравага патэнцыялу сацыяльна-культурнай сферы постчарнобыльскага соцыуму" комплексна прааналізаваны тэарэтычныя і прыкладныя аспекты праблемы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў для сацыяльна-культурнай сферы, спецыялістаў у галіне аматарскай і прафесійнай творчасці. Асаблівая ўвага ўдзяляецца дзейнасці вышэйшых навучальных устаноў па падрыхтоўцы спецыялістаў, якім давядзецца займацца культурнай асветай, тыражыраваннем і трансляцыяй духоўных каштоўнасцей, вытворчасцю і захаваннем, размеркаваннем культурных даброт і паслуг у посткатастрофным соцыуме.

Аналіз існуючай сістэмы падрыхтоўкі кадраў для прафесійных і аматарскіх мастацкіх калектываў, масавых устаноў культуры сведчыць аб тым, што сярэднія і вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны не ў стане забяспечыць патрэбы суб'ектаў сацыяльна-культурнай дзейнасці ў неабходнай колькасці высокакваліфікаваных спецыялістаў. У структуры агульнай падрыхтоўкі кадраў для розных сфер народнай гаспадаркі кадры культуры займаюць вельмі нязначнае месца. Паўстае праблема безумоўнага паляпшэння іх падрыхтоўкі. Статыстычныя даныя паказваюць, што ў канцы XX ст. у нашай дзяржаве мелі вышэйшую адукацыю 14,5% работнікаў клубных устаноў, 37% бібліятэкараў, 19% супрацоўнікаў музеяў.

З улікам рэальнай сітуацыі дысертантам прапанавана канцэпцыя культуралагічнай падрыхтоўкі работнікаў культурна-асветных устаноў



даследуемага соцыуму, якая абапіраецца на наступныя прынцыпы: арыентацыі на канчатковыя мэты ў падрыхтоўцы спецыяліста; праграмна-мэтавага падыходу да арганізацыі навучальнага працэсу, пабудовы апошняга як мэтавай праграмы; адпаведнасці сістэмы прафесійнай адукацыі патрабаванням развіцця грамадства і сучасных псіхолага-педагагічных тэорый.

## ЗАКЛЮЧЭННЕ

У заключэнне вынесены асноўныя вывады і рэкамендацыі, якія атрыманы ў працэсе даследавання, а таксама навукова-практычнага асэнсавання рэальнага бытавання культуры ў канцы 80 — 90-х гадах, культурнай палітыкі дзяржавы і сацыяльна-культурных інстытутаў, што ажыццяўлялася ў кантэксце развіцця эканамічных і сацыяльных працэсаў у посткатастрофным соцыуме.

1. Чарнобыльская сацыяэколагатэхнагенная катастрофа выклікала трансфармацыю сацыяльна-культурнага асяроддзя. Посткатастрофныя працэсы аказваюць дэструктыўны ўплыў на сацыядынаміку грамадства і культуры, структуры вытворчага, псіхалагічнага ўзаемадзеяння людзей, маральна-валявыя якасці і каштоўнасныя арыентацыі насельніцтва, што пражывае на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях. Яны не могуць быць пакінутымі без мэтанакіраванага, сістэмнага і бесперапыннага даследавання з мэтай зніжэння іх негатыўнага патэнцыялу [1, 2,3, 4, 19].

2. У вялікай колькасці людзей, якія трапілі пад радыеактыўнае ўздзеянне, узніклі спецыфічныя псіхагенныя расстройствы хранічнага тыпу. Іх своеасаблівасць заключаецца ў тым, што посттраўматычны сацыярадыеэкалагічны стрэс характарызуецца незвычайнай устойлівасцю, захоўваючы дамінантнае месца ў структуры псіхічных станаў не толькі асобных індывідаў, але і значных па маштабе сацыяльных супольнасцей. Гэты стрэс устойлівы не толькі па сваіх псіхалагічных характарыстыках, але і па працягласці функцыяніравання, ён можа існаваць дзесяцігоддзі. Устойлівы і працяглы стрэсавы стан мае складаную дынаміку, накіраванасць і інтэнсіўнасць выяўлення якой дэтэрмінуецца не толькі знешнімі фактарамі, але і спецыфікай асобасных асаблівасцей тых ці іншых індывідаў. Таму канкрэтызацыя, нават персаніфікацыя праграм рэабілітацыі, змяншэнне ўплыву наступстваў катастрофы маюць прыярытэтны статус у адносінах да іншых відаў дзейнасці ў пацярпелых рэгіёнах [1, 2, 3, 4, 17, 22].

3. Даследаванне вопыту посткатастрофнага развіцця асобных раёнаў Беларусі сведчыць аб тым, што першачарговай задачай грамадства з'яўляецца экалагічная, эканамічная, сацыяльная, сацыяльна-псіхалагічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэабілітацыя пацярпелых ад радыяцыі людзей. Важную ролю ў рэадаптацыі асобы да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці адыгрывае культура, і асабліва мастацтва. Яны, як і мастацка-творчая дзейнасць, могуць спрыяць вяртанню чалавека ў рэчышча сваёй культуры і асабістых відаў дзейнасці, з якіх ён выключаецца па меры фарміравання псіхалагічнага стрэсу, развіцця радыяфобіі [1, 2, 3, 4, 16, 17, 20].

4. Сацыяльна-культурныя інстытуты рэспублікі і посткатастрофнага соцыуму маюць магчымасць сродкамі прафесійнага выяўленчага, музычнага і тэатральнага мастацтва садзейнічаць працэсу самаідэнтыфікацыі чалавека, зняцця найбольш глыбокіх унутраных праблем, адцягвання індывіда, розных катэгорый насельніцтва ад удзелу ў тых ці іншых формах матэрыяльнага або сацыяльнага існавання для таго, каб атрымаць эмацыянальную разрадку [1, 2, 3, 4, 16, 17, 21].

5. У творчым развіцці, духоўным узбагачэнні і самарэалізацыі чалавека значную ролю адыгрывае самадзейная мастацкая творчасць, якая з'яўляецца складанай, шматграннай з'явай у сістэме мастацкай культуры. Аматарская творчасць даследуемага соцыуму ўяўляе сабой масавы сацыякультурны рух, які выступае сродкам далучэння мас да культуры, эстэтычнага, маральнага выхавання, гарманічнага развіцця асобы, з'яўляецца адным са шляхоў стварэння мастацтва, паколькі многае са створанага непрафесійнымі творцамі стала неад'емнай часткай агульначалавечай духоўнай культуры [1, 2, 3, 21, 24].

6. Чарнобыльская катастрофа стварыла рэальную пагрозу незваротнай страты помнікаў нацыянальнай культуры, матэрыяльнай і духоўнай культуры. Першачарговымі задачамі сацыяльна-культурных інстытутаў соцыуму з'яўляюцца даследаванне стану помнікаў гісторыі, археалогіі, архітэктуры і культуры ў пацярпелых раёнах, захаванне і рэстаўрацыя іх, стварэнне ўмоў развіцця традыцыйнай культуры, наладжванне дыялогу і сістэмы ўзаемадзеяння паміж народным мастацтвам і сучасным культурным працэсам ва ўсіх яго праявах, разнавіднасцях, формах. Дзяржава павінна знайсці неабходныя сродкі, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці пераходнага перыяду [1, 2].

7. Псіхагенныя расстройствы, якія ўзніклі ў выніку катастрофы адначасова ў вялікай колькасці людзей, патрабуюць ад сацыяльна-культурных інстытутаў намаганняў па ўдасканаленні традыцыйных і распрацоўцы новых тэхналогій кампенсатарнай дзейнасці. Для рэгулявання эмацыянальнага стану, павышэння сацыяльнай актыўнасці насельніцтва соцыуму ўстановы культуры і мастацтва павінны выкарыстоўваць сучасныя тэхналогіі, якія, аперыруючы сродкамі культуры і мастацтва, мастацка-творчай дзейнасці, могуць актыўна ўплываць на працэс аднаўлення асобаснага і сацыяльнага статусаў людзей, пацярпелых ад наступстваў тэхнагеннай катастрофы [1, 2, 3, 19].



8. Эфектыўным метадам рэсацыялізацыі дэзадаптаваных людзей з'яўляецца бібліятэрапія, якая знаходзіцца на стыку дзвюх навук: бібліятэказнаўства і медыцыны. Калі падыходзіць да бібліятэрапіі з пазіцыі бібліятэчнага работніка, то яна з'яўляецца спецыфічным метадам кіраўніцтва чытаннем. Бібліятэрапія ўключае мноства выхаваўчых, сацыяльных, этычных, эстэтычных, бібліятэчных, псіхалагічных, аздараўленчых задач.

Ажыццяўленне ідэйна-маральных, адукацыйных і вытворчых функцый публічнымі бібліятэкамі посткатастрофнага соцыуму павінна набыць кампенсатарную накіраванасць, якая яшчэ не атрымала ў нашай краіне належных навуковых асэнсавання і развіцця [1,2,3, 4, 14, 15, 18].

9. Асобнае месца сярод мастацтваў па сіле эмацыянальнага ўздзеяння на чалавека займае музыка, якая з'яўляецца магутным стымулам камунікацыі і інтэграцыі. Вывучэнне тэорыі і практыкі музыкатэрапіі паказала, што мэтанакіраванае ўздзеянне музыкі пазітыўна ўплывае на змяненне псіхічнага і саматычнага станаў чалавека. У сувязі з гэтым дзейнасць сацыяльна-культурных устаноў раёнаў, якія найбольш пацярпелі ад радыяцыйнага ўздзеяння, павінна быць скіравана на стварэнне разгалінаванай сеткі музычных цэнтраў на аснове рэфармаваных устаноў культуры і мастацтва, музычных школ і вучылішчаў [1, 2, 22].

10. Тэатратэрапія як метад адаптацыі людзей з выяўленым посттраўматычным псіхалагічным стрэсам да паўнацэннага жыцця набывае шырокае развіццё ў краінах Заходняй Еўропы і СНД. Даследаванне паказала, што вялікія рэкрэацыйныя і кампенсатарныя магчымасці існуюць ў прафесійных і аматарскіх тэатраў, самадзейных тэатральна-драматычных гурткоў.

Першачарговай задачай сацыяльна-культурных устаноў з'яўляецца распрацоўка канцэпцыі рэабілітацыйна-катарсіснага ўздзеяння на асобу пры дапамозе сцэнічных твораў, стварэнне драматургічных і сцэнічных твораў, якія б абаранялі насельніцтва соцыуму ад страху, трывожнасці, хвалявання, выкліканых чарнобыльскай трагедыяй [1, 2, 3].

11. Творчыя віды сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі, і ў прыватнасці арттэрапія, гештальттэрапія, актыўна ўкараняліся ў практыку кампенсатарнай дзейнасці медыцынскіх, культурна-асветніцкіх устаноў шэрага краін Еўропы. Даследаванні паказалі, што на людзей з псіхагеннымі расстройствамі дабратворна ўплываюць не толькі сузіранне твораў выяўленчага мастацтва, але і яшчэ ў большай ступені непасрэдны ўдзел у самадзейнай выяўленчай творчасці. Маляванне, лепка, разьба па дрэве, чаканка і іншыя прыкладныя віды мастацтва дапамагаюць дэзадаптаваным людзям перш за ўсё тым, што адцягваюць іх ад перажыванняў прыемным заняткам, які патрабуе затраты эмацыянальных і інтэлектуальных сіл [1, 2, 20].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

12. Эфектыўнасць работы сацыяльна-культурных інстытутаў, скіраваная на аднаўленне здольнасці да сацыяльнага функцыяніравання дэзадаптаванага насельніцтва посткатастрофнага соцыуму, залежыць ад наяўнасці кадраў, спецыяльна падрыхтаваных да рэкрэацыйнай і кампенсатарнай дзейнасці. Сацыяльна-культурная трансфармацыя, посткатастрофныя працэсы, якія адбываюцца ў даследуемым соцыуме, выклікаюць неабходнасць стварэння сістэмы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, што валодаюць сучаснымі тэхналогіямі сацыякультурнай дзейнасці [1, 2, 6, 7, 8, 9, 10, 11, 12].



## СПІС АПУБЛІКАВАНЫХ РАБОТ ПА ТЭМЕ ДЫСЕРТАЦЫІ

1. Смолік А.І. Сацыядынаміка культуры ў посткатастрофным соцыуме / Бел. ун-т культуры. — Мінск, 1999. — 247 с.

2. Смолік А.І. Сацыяльна-культурная дзейнасць у постчарнобыльскім соцыуме: Вучэб.дапам. для вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў / Бел. ун-т культуры. — Мінск, 1999. — 228 с.

3. Дзейнасць устаноў культуры па мінімізацыі наступстваў чарнобыльскай трагедыі / Бел. ун-т культуры; А.І.Смолік, У.А.Мамонька, А.Р.Маісеенка і інш.; Пад рэд. А.І.Смоліка. — Мінск, 1999. — 160 с.

4. Сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя насельніцтва мастацтвам: Практ. дапам. для работнікаў культуры / Бел. ун-т культуры; С.В.Аўдзей, Л.І.Казлоўская, А.І.Смолік і інш.; Пад рэд. А.І.Смоліка. — Мінск, 1998. — 82 с.

5. Канапацкий И.Б., Смолик А.И. Как повысить эффективность // Слово лектора. — 1987. — № 12. — С. 44—46.

6. Смолик А.И. Совершенствование форм и методов профессионального отбора и довузовской подготовки молодёжи // Актуальные проблемы психологии и педагогики довузовской подготовки: (Материалы межвуз.конф.), [12—15 нояб. 1990 г.] / Мин. гос. пед. ин-т. — Минск, 1991. — С.51—53.

7. Смолік А.І. Дыпломныя і курсавыя працы як сродак далучэння студэнтаў да нацыянальных традыцый // Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці студэнтаў: Зб.навук.арт. / Мін. дзярж. пед. ін-т, Пед. т-ва Рэсп. Беларусь. — Мінск, 1993. — С.17—19.

8. Смолік А.І. Пераход да сусветных тэхналогій і сістэм падрыхтоўкі культуралагічных кадраў: вынікі і праблемы // Прафесіяналізм выкладчыкаў універсітэта ва ўмовах перахода да шматузроўневай сістэмы адукацыі: Тэз. дакл. на навук.-метад. канф. (1–2 лют.1994г.)/Бел. ун-т культуры.— Мінск,1994.— С.4—5.

9. Смолік А.І. Гуманітарны аспект інфармацыйнай культуры выпускніка універсітэта // Праблемы ўдасканалення гуманітарнай і прафесійнай адукацыі: Тэз.дакл. на навук.-метад. канф. (2—3 лют. 1995г.) / Бел. ун-т культуры. — Мінск, 1995. — С.3.

10.Смолік А.І. Фарміраванне творчай дзейнасці на аснове камп'ютэрызацыі выкладання гісторыі // Развіццё творчых здольнасцей студэнтаў: праблемы, пошукі, рашэнні: Дакл., прачытаныя на навук.-метад. канф. (1—2 лют. 1996 г.)/Бел. ун-т культуры. — Мінск, 1997. — С.26—30.

11. Смолік А.І. Гістарычная адукацыя — састаўная частка сацыяльна-гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў // Культуралагічная падрыхтоўка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтаў у сістэме ВНУ: Дакл., прачытаныя на навук.-метад. канф. (4—5 лютага 1997 г.) / Бел. ун-т культуры. — Мінск, 1998. — С.65—72.

12. Смолік А.І. Фарміраванне кадравага патэнцыялу сацыяльна-культурнай сферы Беларусі // Навчально-виховний процес у вузі і школі та шляхи його розвитку і удосконалення: Зб. праць міжнар. наук.-практ. конф. — Рівне, 1999. — С.149—152.

13. Смолік А.І. Сацыякультурная сітуацыя ў канцы XX стагоддзя // Культура Беларусі: навуковы пошук моладзі: Матэрыялы навук. канф. аспірантаў (14 мая 1997 г.): У 2 ч. / Бел.ун-т культуры. — Мінск, 1999.— Ч.2.— С.11—18.

14. Смолік А.І Кампенсатарная дзейнасць сучасных публічных бібліятэк // Современная библиотека: концепция развития: Тез. докл. междунар. науч.-практ. конф., 11—14 мая 1999 г. — Мінск, 1999. — С.14—17.

15. Смолік А.І. Бібліятэка ва ўмовах сацыяльна-культурнай трансфармацыі грамадства // Бібліятэчны свет. — 1999. — № 2 (11). — С.14—15.

16. Смолік А.І. Народнае мастацтва як сродак маральна-эстэтычнага выхавання асобы посткатастрофнага соцыуму // Праблемы выхавання. — 1999. — № 2 (15). — С.9—17.

17. Смолік А.І. Рэгуляванне эмацыянальнага стану і павышэнне сацыяльнай актыўнасці асобы сродкамі мастацтва // Сацыяльна-педагагічная работа. — 1999. — № 3 (13). — С.8—18.

18. Смолік А.І. Бібліятэрапія як метад рэадаптацыі насельніцтва да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці // Здаровы лад жыцця. — 1999. № 2 (8). — С.2—26.

19. Смолік А.І. Деятельность социально-культурных институтов в посткатастрофном социуме // Социально-психологическая реабилитация населения, пострадавшего от экологических и техногенных катастроф: VI Междунар. конф., Минск, Респ. Беларусь, 26—29 мая 1999 г.: Материалы конф. — Минск, 1999. — С.181.

20. Смолік А.І. Арттэрапія ў стандарце па сацыяльнай рабоце // Стандарты вышэйшай культуралагічнай і мастацкай адукацыі: тэарэтыка-метадалагічныя аспекты: Матэрыялы міжвуз. навук.-метад. канф., 2—3 лют. 1999 / Бел. ун-т культуры. — Мінск, 1999. — С.87—93.

21. Смолік А.І. Аматарская мастацкая творчасць як сродак сацыялізацыі асобы // IV Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры (Мінск, 24—26 мая 1998 г.): Матэрыялы чытанняў: У 2 ч. / ЕГУ, БУК. — Мінск, 1999. — С.23 — 27.

22. Смолік А.І. Музыкатэрапія як сродак адаптацыі асобы да посткатастрофных умоў жыццядзейнасці // Псіхалогія. — 1999. — № 3 (16). — С.106 — 113.



23. Смолік А.І. Асэнсаванне чарнобыльскай трагедыі ў выяўленчым мастацтве // Перспектыўныя накірункі фарміравання духоўнай і мастацкай культуры студэнтаў: Матэрыялы навук. далед. / Бел.ун-т культуры. — Мінск, 1999. — С.3—8.

24. Смолік А.І. Рэалізацыя інтэлектуальна-творчага патэнцыялу асобы ў працэсе самадзейнай мастацкай творчасці // Народныя музычныя інструменты ў мастацкай культуры XX стагоддзя: Зб. навук. арт. / Бел. ун-т культуры. — Мінск, 1999. — С.34—38.

25. Смолік А.І. Дамінанта культуратворчай дзейнасці на мяжы стагоддзяў // Полымя. — 1999. — № 10 (846). — С.172—178.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# РЭЗЮМЕ
## Смолік Аляксандр Іванавіч
## Дзейнасць сацыяльна-культурных інстытутаў Беларусі ў посткатастрофным соцыуме

*Посткатастрофны соцыум, інстытуцыялізацыя, сацыяльна-культурны інстытут, функцыя, сацыякультурная дзейнасць, культура, мастацтва, формы, метады, сродкі, тэхналогіі, сацыяльна-псіхалагічная рэабілітацыя, бібліятэрапія, музыкатэрапія, арттэрапія.*

Аб'ект даследавання: сацыяльна-культурныя інстытуты посткатастрофнага соцыуму Рэспублікі Беларусь.

Асноўная мэта даследавання: вызначыць сутнасць, змест, формы і тэхналогіі сацыякультурнай дзейнасці ў посткатастрофны перыяд.

Навуковая навізна і тэарэтычная значнасць: у даследаванні выкарыстаны метад сістэмна-функцыянальнага аналізу пры разглядзе сацыяльна-культурнай дзейнасці ўстаноў культуры ў рэгіёнах, якія найбольш пацярпелі ад чарнобыльскай катастрофы; абгрунтавана палажэнне аб узаемасувязі дынамікі інфраструктуры культуры і якасных змяненняў, што адбываюцца ў посткатастрофны перыяд; упершыню даследуецца спецыфіка сацыяльна-культурнага асяроддзя Гомельскай і Магілёўскай абласцей, найбольш пацярпелых у выніку аварыі на ЧАЭС; вызначаны формы і метады дзейнасці сацыякультурных інстытутаў па фарміраванні і ўзнаўленні індывідуальнай і грамадскай каштоўнасці асобы посткатастрофнага грамадства; прапанавана сістэма спецыяльных мер, якія ў посткатастрофных умовах жыццядзейнасці могуць забяспечыць эфектыўнае функцыяніраванне сацыякультурных інстытутаў і актыўна ўплываць на творчае развіццё і духоўнае ўзбагачэнне насельніцтва соцыуму; праведзены аналіз нетрадыцыйных метадаў і формаў сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі пацярпелых ад катастрофы сродкамі мастацтва і творчага самавыяўлення.

Атрыманыя ў выніку дысертацыйнага даследавання матэрыялы могуць выкарыстоўвацца работнікамі ўстаноў культуры і мастацтва, сацыяльнымі педагогамі, псіхолагамі ў дзейнасці па сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі насельніцтва, пацярпелага ад тэхнагенных і гуманітарных катастроф, выкладчыкамі ВНУ ў якасці лекцыйнага матэрыялу. На іх аснове можна распрацоўваць рэгіянальныя мэтавыя сацыяльна-культурныя праграмы, арганізоўваць цэнтры па рэабілітацыі асобы сродкамі мастацтва і мастацка-творчай дзейнасці, спецыялізаваныя бібліятэкі, установы культуры новага тыпу, якія ствараюць арганізацыйна-творчыя ўмовы для ажыццяўлення грамадска значнай культурнай дзейнасці пэўнай групы насельніцтва на аснове яе самаарганізацыі і ініцыятывы.



# РЕЗЮМЕ
## Смолик Александр Иванович
## Деятельность социально-культурных институтов Беларуси в посткатастрофном социуме

*Посткатастрофный социум, институциализация, социально-культурный институт, функция, социокультурная деятельность, культура, искусство, формы, методы, средства, технологии, социально-психологическая реабилитация, библиотерапия, музыкатерапия, арттерапия.*

Объект исследования: социально-культурные институты посткатастрофного социума Республики Беларусь.

Основная цель исследования: выяснить сущность, содержание, формы и технологии социально-культурной деятельности в посткатастрофный период.

Научная новизна и теоретическая значимость: в исследовании обосновано положение о взаимосвязи динамики инфраструктуры культуры и качественных изменений, происходящих в посткатастрофный период; впервые исследуется специфика социально-культурной среды Гомельской и Могилевской областей, наиболее пострадавших в результате аварии на ЧАЭС; определены формы и методы деятельности социокультурных институтов по формированию и восстановлению индивидуальной и общественной ценности личности посткатастрофного общества; предложена система специальных мер, которые в посткатастрофных условиях жизнедеятельности могут обеспечить эффективное функционирование социокультурных институтов и активно влиять на творческое развитие и духовное обогащение населения социума; проведен анализ нетрадиционных методов и форм социально-психологической реабилитации.

Полученные в результате диссертационного исследования материалы могут использоваться работниками учреждений культуры и искусства, социальными педагогами, психологами в деятельности по социально-психологической реабилитации населения, пострадавшего от техногенных и гуманитарных катастроф, преподавателями вузов в качестве лекционного материала. На их основе можно разрабатывать региональные целевые социально-культурные программы, организовывать центры по реабилитации личности средствами искусства и художественно-творческой деятельности, специализированные библиотеки, учреждения культуры нового типа, которые создают организационно-творческие условия для осуществления общественно значимой культурной деятельности определенной группы населения на основе ее самоорганизации и инициативы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**SUMMARY**
**Smolic Alexander Ivanovich**
**The activity of Social-Cultural of Belarus Institutions in Post-Catastrophe Society**

*Post-catastrophe society, institutialisation, social-cultural institution, culture, art, social-cultural activities, functions, methods, means, technology, social-psychologic rehabilitation, biblio-therapy, music-therapy, art-therapy.*

The object of the research: the social-cultural institutions of the Republic of Belarus.

The main aim of the research: to find out the essense, the contens, the forms and the technology of the social-cultural activities in the post-catastrophe period.

The scientific novelty and theoretical significance of the research: in the research the method of system-functional analysis is used to consider the social-cultural activities of enterprises, organisations and cultural institutions located in the regions severely suffered from the Chernobyl catastrophe; the thesis of inter-communication of infra-structure dynamics in the culture and qualitative changes which are going on in the post-catastrophe period is grounded; it is for the first time when the specefic character of social-cultural environment of Gomel and Mogilev regions are studied. These regions have suffered from the Chernobyl catastrophe severer than others; the author defines the forms and methods of the activity of social-cultural institutions aimed to creation and rehabilitation the individual and social value of personality in the post-catastrophe society; the author offers the system of some special measures to be undertaken in post-catastrophe conditions to maintain the vital activity and active function of social-cultural institutions and have active influence on creative development and spiritual enrichment of a personality; the analysis of untraditional methods and forms of social-psycholagic rehabilitation for those who have suffered from the catastrophe.

The results of the dissertation research can be used by the workers of cultural and art institutions, social teachers and psychologists in the sphere of social-psychologic rehabilitation of the people who have suffered from technical and humanitarian catastrophes. The University lecturers can use this material in their lectures. Using the results of the research one can create regional social-cultural programs, centers for rehabilitations of people by means of art and creative activity, specialized libraries, institutions of culture of new type which create all conditions to realize socially important cultural activity of a certain group of population on the base of its selforganization and initiative.

Навуковае выданне

**Смолік Аляксандр Іванавіч**

**ДЗЕЙНАСЦЬ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНЫХ ІНСТЫТУТАЎ БЕЛАРУСІ Ў ПОСТКАТАСТРОФНЫМ СОЦЫУМЕ**

**Аўтарэферат**
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
доктара культуралогіі

Падп.да друку 05.II.99. Фармат 60x84 1/16. Папера пісчая № 2.
Ум. друк. арк.2,32. Ул.выд.арк. 2.08. Зак. 92. Тыр.100 экз.

Рызограф Беларускага універсітэта культуры.
220001, Мінск, вул. Рабкораўская, 17.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ